Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Чаму ўзнікаюць рознага кшталту «падводныя рыфы» пры долевым будаўніцтве, як іх пазбегнуць, як не «апячыся» пры гэтым, што абавязкова трэба ведаць і ўлічваць пры заключэнні дагавора на будаўніцтва... СТАР. 6

Канікулы завяршаюцца, і паўстае пытанне: як засцерагчы на пачатку навучальнага года нашых дзяцей ад непрыемнасцяў на дарогах і вуліцах, што павіны зрабіць дзеля гэтага настаўнікі, работнікі ДАІ і бацькі? СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЖНІЎНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 157 (27522) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НЯЎВАЖЛІВА СТАВІЦЦА ДА ЛЮДЗЕЙ ПРЫ БАРАЦЬБЕ З АЧС — НЕДАПУШЧАЛЬНА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка папярэджвае аб недапушчальнасці няўважлівага стаўлення чыноўнікаў да людзей пры барацьбе з афрыканскай чумой свіней і патрабуе аказваць насельніцтву ўсялякае садзейнічанне. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе аб эпізаатычнай сітуацыі ў свінагадоўлі і мерах барацьбы з вірусным захворваннем свіней, перадае БЕЛТА.

«Мяне не столькі трывожыць сам працэс гэтай барацьбы, колькі тое, як рэагуе насельніцтва на меры, што прымаюцца органамі ўлады і ветэрынарнымі службамі. Я ўсё больш і больш атрымліваю сігналаў, у Адміністрацыі Прэзідэнта мы фіксуем узрастаючую колькасць зваротаў грамадзян па гэтых пытаннях. Сутнасць іх зводзіцца да таго, што мы часам няўважліва, а часам па-хамску паводзім сябе з людзьмі. Гэта значыць мы, здавалася б, выконваем святую місію — змагаемся з гэтай заразай, але ў той жа час ствараем новую праблему — негатыўнае рэагаванне людзей на нашы дзеянні, дзеянні ветэрынарных службаў. Павінен вас папярэдзіць: гэта недапушчальна», — сказаў Прэзідэнт.

«Хацеў бы, каб з наступнага тыдня такіх заяў ад насельніцтва ў мой адрас не паступала, — папярэдзіў Прэзідэнт. — Вашы тлумачэнні, што вы правільна робіце, вы добрыя, а людзі дрэнныя, прымацца не будуць!»

«Вы там, калі ласка, на месцы разбярыцеся з кожным чалавекам. Не думаю, што ў нас знойдзецца шмат людзей, якія ад няма чаго рабіць будуць займацца пісанінай у адрас Прэзідэнта з просьбай аб прыняцці нейкіх мер. Таму з гэтага моманту мы з вамі дамовіліся: ад людзей скаргаў быць не павінна! Стаўцеся да людзей па-чалавечы, ліквідуючы гэту заразу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных у зале.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што АЧС не ўяўляе пагрозы для здароўя людзей. Ён са шкадаваннем заўважыў, што ў свеце яшчэ не выпрацавалі эфектыўных мер барацьбы з гэтай хваробай, не існуе вакцыны, а адзінае выйсце — гэта лакалізацыя ачагоў, знішчэнне захварэлых жывёл для прадухілення распаўсюджвання хваробы.

«Прычынамі таго, што нам даводзіцца ліквідаваць гэту заразу, з'яўляецца парушэнне элементарных санітарных норм, каранціннага рэжыму на фермах і прыватных падворках, і гэта можа прывесці да пашырэння зоны эпідэміі, нанясення значнага ўрону як свінагадоўчай галіне, так і эканоміцы краіны ў цэлым», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што галоўная праблема — эканамічная. «Мы ні ў якім выпадку не павінны дапусціць распаўсюджвання гэтай хваробы і падзяжу свіней, будзе гэта на прыватных падворках, на фермах або на комплексах. Мы і так ужо страцілі, няхай няшмат, але гэта не адзін мільярд рублёў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Для Беларусі развіццё свінагадоўлі мае вялікае значэнне. Ва ўсіх рэгіёнах функцыянуюць магутныя свінагадоўчыя комплексы, прадукцыя з якіх паступае не толькі на ўнутраны рынак, але і на экспарт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на комплексах прымаюцца жорсткія меры, і нідзе не зафіксавана паўторнага з'яўлення хваробы. Найбольшую заклапочанасць у Прэзідэнта выклікаюць дробныя фермы і прыватныя падворкі. Паводле слоў Прэзідэнта, у 97 выпадках са 100 жывёла заразілася ў прыватных падворках, а таму неабходна прымаць усялякія меры, каб не дапусціць пераносу захворвання на буйныя комплексы або фермы.

«Страту галіны мы ні ў якім выпадку дапусціць не можам. Не менш важны і той факт, што амаль на кожным сельскім падворку гадуюць свіней як для ўласных патрэб, так і для продажу на рынак, тым самым папаўняючы харчовыя рэсурсы краіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што ў прыватных падворках гадуюцца амаль 900 тыс. свіней, што складае больш як 20 працэнтаў усяго пагалоўя свіней у Беларусі. «Таму мы павінны аказаць істотную дапамогу насельніцтву ў барацьбе з гэтай заразай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На думку кіраўніка дзяржавы, для таго каб не дапусціць распаўсюджвання хваробы, трэба прымаць прэвентыўныя меры. У якасці прыкладу Прэзідэнт прывёў вопыт Мінскай вобласці, дзе забой жывёлы ажыццяўляюць на мясакамбінаце, а потым чалавек або забірае мяса, або пакідае там за грашовую кампенсацыю. «Калі вы нармальна заплаціце чалавеку за кожны кілаграм свініны або жывой вагі, ён вам яе аддасць. Таму каб не дапусціць ліквідацыі жывёлы, лепш у зонах рызыкі здаць цяпер здаровую жывёлу на мясакамбінат», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, на гэтай бядзе пачынаюць іграць розныя дэструктыўныя сілы, нагнятаючы абстаноўку. «Мы не павінны даваць падставы, каб гэтыя нягоднікі раздувалі пажар у нашым грамадстве», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ва ўрадзе створаны спецыяльны штаб, прымаюцца пэўныя меры, аднак нараканняў з боку людзей на такую работу нямала. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзяржава не можа стаяць у баку ад гэтай праблемы, у тым ліку ад вырашэння яе фінансавых пытанняў.

Аляксандр Лукашэнка выказаў занепакоенасць тым, што афрыканская чума свіней набывае распаўсюджванне ў Расіі. Выяўлены яшчэ адзін вялікі ачаг у Яраслаўскай вобласці. «Адгарадзіцца ад усяго свету мы не можам, тым больш ад Расіі, таму трэба тут, на месцы, прымаць эфектыўныя меры», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

КУДЫ АДПЛЫВАЕ АЗЁРНАЕ ЛЕТА?

Незвычайны плыт курсіруе па возеры Должына, на маляўнічым беразе якога знаходзіцца санаторый «Лясныя азёры». Дарэчы, гэты плавальны сродак зроблены ўласнымі намаганнямі здраўніцы. Цяпер у санаторыі, акрамя беларусаў, адпачывае шмат гасцей з Расіі. Вандроўкі па ціхім возеры часта суправаджаюцца любімымі песнямі мінулых гадоў.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

1518,7 тыс. кв.м

агульнай плошчы жылля ўведзена ў эксплуатацыю ў студзені—ліпені 2013 года для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта 53,9 працэнта ў агульным аб'ёме ўведзенага жылля. У параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года ўвод жылля ў эксплуатацыю для гэтай катэгорыі грамадзян павялічыўся на 10,7 тыс. кв.м, або на 0,7 працэнта. Усяго ў студзені—ліпені гэтага года арганізацыі ўсіх форм уласнасці ўвялі ў эксплуатацыю 33 тыс. новых кватэр.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.08.2013 г.

Долар ЗША	8930,00	▲
Еўра	11920,00	▼
Рас. руб.	269,00	▼
Укр. грыўня	1098,40	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 18°
Віцебск	+ 16°
Гомель	+ 23°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 21°
Мінск	+ 17°

■ Жыллёвае пытанне

КВАДРАТНЫ МЕТР ПАЙШОЎ УГОРУ І Ў РЭГІЁНАХ

Эксперты адзначаюць сур'ёзнае падаражанне кватэр у абласных цэнтрах Беларусі

Яшчэ ў пачатку зімы ў сталіцы стартавала хваля падаражання кватэр на другасным рынку жыллёвай нерухомасці. Увесну і нават летам цэны на жыллё працягвалі расці далей. Падобныя тэндэнцыі зараз назіраюцца і на рэгіянальных другасных рынках гарадской нерухомасці. Пра сённяшнюю сітуацыю з цэнамі на жыллё ў рэгіёнах і прагнозы на бліжэйшыя месяцы карэспандэнту «Звязды» паведамілі галоўныя «гульцы» другаснага рынку нерухомасці абласных цэнтраў Беларусі. Высветлілася, што нават у суседніх рэгіянальных цэнтрах тэндэнцыі на рынку жылля падобныя, але рэальныя сітуацыі адрозніваюцца.

Ліквідных кватэр у Брэсце амаль няма

Менавіта гэты заходні фарпост з'яўляецца другім горадам у краіне, дзе кватэры на другасным рынку жылля даражэюць больш інтэнсіўна.

Дырэктар Брэсцкага агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг Анатоль ВАЙТОВІЧ паведаміў рэдакцыі, што цяпер кошт квадратнага метра агульнай плошчы нават не зусім якасных аднапакаёвых «хрушчовак» пачаў набліжацца да тысячы долараў. Такія аднапакаёўкі агульнай плошчай да 30—32 квадратных метраў прапануюцца на рынку за 30—31 тыс. долараў. Апошнім часам павялічыўся кошт і на зусім дробненькія «маласямейкі» (плошча да 22—24 кв. м), якія сёння прадаюцца прыкладна за 25—26 тысяч долараў.

Аднапакаёвыя кватэры новай планіроўкі і плошчай да 36 кв. метраў прапануюцца пакупнікам за 35—38 тысяч, а больш прасторныя жылыя памяшканні (каля 43 кв. метраў) у новых дамах — ад 40 да 45 тысяч долараў. Ёсць у Брэсце і элітныя аднапакаёўкі агульнай плошчай да 50—60 кв. метраў. Такое жыллё ўжо з якасным рамонтам каштуе ад 70 да 80 тысяч долараў.

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр пачынаецца з 35—36 тысяч долараў. Гэта маленькія «хрушчоўкі» плошчай ад 38 да 40 кв. метраў. Сярэдні кошт стандартных двухпакаёвак дасягае зараз 45 тысяч і больш, калі агульная плошча кватэр складае ад 46 да 53 кв. метраў. Мінімальным попытам карыстаюцца ў Брэсце зусім «слабыя» па якасці трохпакаёвыя «хрушчоўкі», калі 50—53 «квадраты» каштуюць ад 43 да 45 тысяч долараў. Сярэдні кошт стандартных трохпакаёвак у панэльных дамах вагаецца ад 55 да 60 тысяч долараў.

У гэтым выпадку назіраецца такая тэндэнцыя: чым больш плошча стандартнай кватэры — тым менш каштуе квадратны метр.

Анатоль Вайтовіч адзначае, што цяпер ліквідных кватэр у горадзе над Бугам амаль не засталося. Кватэры прымальнай якасці па рэальным кошце прадаюцца на рынку на працягу некалькіх дзён. Аднак прадаўцы сёння ў «фаворы», і менавіта яны дыктуюць умовы.

Толькі з мая цэны на стандартныя двухпакаёўкі падскочылі прыкладна на 3—4 тысячы долараў. Спецыялісты гэтага абласнога цэнтра ўпэўнены, што ў бліжэйшыя 4 месяцы жыллё на другасным рынку будзе і надалей даражэць. Толькі за восень цэнні на кватэры пацяжэюць яшчэ мінімум на 4—7 працэнтаў, упэўнены Анатоль Вайтовіч. СТАР. 2

■ Культурнае вымярэнне

На чым прысягаюць украінскія прэзідэнты і навошта славенцам лыжны слоўнік?

Адказы на гэтыя і некаторыя іншыя неардынарныя пытанні нечакана знайшліся на кніжнай выставе, што прэзентуе новыя выданні, падораныя Беларусі краінамі — удзельніцамі XV Міжнароднага з'езда славістаў. Аказалася, гэта не проста кнігі. У іх быццам упісаны тыя праблемы і перажыванні, якія сёння па-свойму хвалююць кожную славянскую краіну.

Для Украіны вызначальная тэма — гэта шаўчэнказнаўства. У наступным годзе яны будуць святкаваць 200-годдзе з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі. Таму актыўна працуюць над стварэннем 6-томнай энцыклапедыі жыцця і творчасці гэтага аўтара. Выйдзе і поўны збор твораў — з 12 тамоў.

Украінскі акадэмік Мікола Жулінскі прадэманстраваў факсімільнае выданне Перасопніцкага Евангелля XVI стагоддзя. На арыгінале гэтай кнігі ўсе прэзідэнты Украіны прамаўляюць клятву. Яна з'яўляецца такой важнай, бо гэта першы пераклад Евангелля на зразумелую ўкраінцам мову, зроблены на іх Палессі.

Было цікава назіраць, як Жулінскі старанна падпісваў кнігу сябрам з іншай краіны, а пасля на адной са старонак намаляваў вялікі вясёлы смайлік! Вось такія гумар і весялосць, аказваецца, уласцівыя навукоўцам-акадэмікам. Аднак па сур'ёзнай тэме Жулінскі таксама выказаўся:

— Мы добра разумеем вашы праблемы, звязаныя з мовай, бо ў нас яны таксама ёсць. Дзяржаўная мова адна, але шмат і рускамоўнага насельніцтва — гэта вынік русіфікацыі, што праводзілася ва Украіне некалькі стагоддзяў. Ёсць дэпутаты, якія хацелі ўвесці рускую мову як другую дзяржаўную, аднак гэта ім не ўдалося. Тое, што вы разумееце пад трасянкай, існуе і ў нас, але мае іншую назву — суржык. СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯПОНІЯ І УКРАІНА БУДУЦЬ САЧЫЦЬ ЗА СТАНАМ АЭС

Для гэтых мэт, як плануецца, у 2014 годзе на арбіту з дапамогай украінскай ракеты-носьбіта будуць выведзены спецыяльныя касмічныя апараты. Японскія СМІ паведамляюць, што спецыялісты Такійскага ўніверсітэта ўжо прыступілі да распрацоўкі мініяцюрных спадарожнікаў, якія дазваляюць збіраць інфармацыю аб суседніх з аварыйнымі АЭС раёнах. З дапамогай такіх спадарожнікаў, у прыватнасці, можна будзе вызначыць ступень пранікнення і распаўсюджвання радыеактыўных рэчываў і ацаніць эфект уздзеяння на прыроду.

У ІТАЛІІ ЗНІШЧАНА БОЛЬШ ЗА ПАЎМІЛЬЁНА КУРЭЙ

Успышка небяспечнага захворвання была лакалізавана ў птушкагадоўчай гаспадарцы ў ваколіцах Мардана паблізу Балоні. Некалькі дзён таму падобная «зачыстка» была праведзена на ферме ў мястэчку Астэлата (раён Ферары), дзе былі забіты 128 тыс. курэй, заражаных вірусам птушынага грыпу тыпу H7.

ІНФАРМАТАРУ WIKILEAKS ДАЛІ 35 ГАДОЎ ТУРМЫ

Інфарматар WikiLeaks, 25-гадовы радавы амерыканскай арміі Брэдлі Мэнінг, якога абвінавачваюць ва ўцечцы сотняў тысяч сакрэтных матэрыялаў, асуджаны ваенным судом да 35 гадоў пазбаўлення волі, паведамляюць інфармагенцтвы. Мэнінг прызнаны вінаватым па 20 пунктах — пераважна за шпіянаж, крадзеж і махлярства. Па самым сур'ёзным пункце — дапамога ворагу — ён быў апраўданы, інакш яму пагражаў бы пажыццёвы тэрмін.

ТОЛЬКІ КІПЯЧЭННЕ БЯЛІЗНЫ ПАЗБАВІЦЬ АД БАКТЭРЫЙ

Свежы пах ад памытай бялізны не азначае, што яна сапраўды чыстая. Як паказалі даследаванні, калі мыць яе пры нізкай тэмпературы, то ў бялізне размножацца шкодныя бактэрыі, піша The Daily Mail. Мікрабіёлагі выявілі, што паказчыкі патагенаў у пральных машынах і ў, здавалася б, чыстай бялізне, проста зашкальваюць. Доктар Ліза Окерлі падкрэслівае: на кожнай пары элементаў жаночай ніжняй бялізны знайшлі ў сярэднім па 10000 мікраарганізмаў. Гэта значыць, што падчас мыцця бактэрыі не выдаляюцца. Гэта асабліва небяспечна, калі казаць пра ніжнюю бялізну, ручнікі для твару, пялёнкі і кухонныя ручнікі, якімі выціраюць посуд і прадукты. Так і адбываецца перакрыжаванае заражэнне. А ў дзвюх сталовых лыжках вады з машынкі, напрыклад, змяшчаецца адзін мільён бактэрый. Калі ж мыюцца рэчы хворага чалавека, хутчэй за ўсё, неўзабаве заразяцца і ўсе астатнія члены сям'і.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

УКРАІНСКІЯ ДЭПУТАТЫ ПРАПАНАВАЛІ СКАРАЦІЦЬ ПРАЦОЎНЫ ДЗЕНЬ

У Вярхоўную Раду Украіны ўнесены законапраект, заклікаць скараціць максімальную працягласць працоўнага тыдня з 40 да 38 гадзін. З такой ініцыятывай выступілі дэпутаты ад апазіцыйнай «Бацькаўшчыны». Палітыкі прапанавалі ўнесці змены ў Працоўны кодэкс, спасылаючыся на «еўрапейскія стандарты». У тлумачальнай запісцы да дакумента сказана, што працадаўцы сёння выкарыстоўваюць «фармалістычны» падыход да разліку працоўнага часу. Так, пачаткам працоўнага дня лічыцца той момант, калі работнік непасрэдна прыступае да выканання сваіх абавязкаў. «Між тым цяжкая дарога ў душным, перапоўненым людзьмі грамадскім транспарце да месца працы ў пачатку працоўнага дня і дадому ў канцы працоўнага дня, як правіла, у час пік, часта адбірае дзве-тры гадзіны законнага адпачынку», — сцвярджаюць аўтары дакумента. Каментуючы прапанаваны законапраект, адзін з яго аўтараў заявіў, што дакумент з'яўляецца адказам апазіцыі на ініцыятывы алігархаў, якія лабіруюць павелічэнне працоўнага тыдня ў краіне да 48 гадзін.

КАРОТКА

Міжнародная асацыяцыя паветранага транспарту (IATA) пацвердзіла, што статус нацыянальнай авіякампаніі «Белавія» адпавядае патрабаванням міжнародных стандартаў, і прадоўжыла тэрмін дзеяння сертыфіката IOSA да 16 лістапада 2015 года.

Фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» пройдзе 15-20 верасня ў Растове-на-Доне.

Дзве службовыя асобы прыватнай фірмы ў Мінску падазраюцца ў няплаце падаткаў на Br2,7 млрд. Абвінавачаныя актыўна супрацоўнічаюць са следствам, віну прызналі цалкам, таксама пагасілі частку нанесенай дзяржаве шкоды — больш як Br1,5 млрд.

У Мінску ў раёне вуліцы Арлоўскай п'яны хуліган ноччу пашкодзіў восем прыпаркаваных машын. Міліцыянеры затрымалі дэбашыра, ім аказаўся 22-гадовы раней судзімы мінчанін, які нападалёк распіваў спіртное са знаёмымі.

■ Расклад на заўтра

КАБ ШКОЛЫ НЕ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ НАСТАЎНІКАЎ

...у сталіцы збіраюцца адрадзіць работу педагагічнага каледжа

«Якасць гімназічнай адукацыі стане ў наступным навучальным годзе аб'ектам нашай сур'ёзнай увагі», — заявіў падчас гарадскога форуму сталічных педагогаў старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК. Кіраўнік сістэмы адукацыі з гонарам адзначыў, што вынікі апошняга навучальнага года пацвердзілі высокую марку сталічнай адукацыі, але, разам з тым, не стаў утойваць і праблемы, якія давядзецца вырашаць педагогам горада.

Скажам, чым не прадмет для гонару: мінскія школьнікі ўжо трынаццаты год лідзіруюць у рэспубліканскіх прадметных алімпіядах па колькасці заваяваных узнагарод. Да таго ж 42 сталічныя школьнікі сталі сёлета прызёрамі і пераможцамі міжнародных алімпіяд і навукова-практычных канферэнцый. Усё гэта вынік добра наладжанай у горадзе работы педагогаў з адоранай моладдзю. Але адрыў каманды сталічных школьнікаў ад вынікаў каманд з іншых рэгіёнаў няўхільна скарачаецца, і ў апошнія два гады ён дасягнуў, так бы мовіць, крытычнага значэння — у 16 дыпломаў. Зніжаецца і «якасць» дыпломаў: сёлета толькі кожны трэці заваяваны мінскімі школьнікамі дыплом быў першай ступені.

А калі прааналізаваць вынікі ўдзелу сталічных школьнікаў у заключным туры рэспубліканскай алімпіяды, то атрымліваецца, што на агульнакамандны поспех сталічнай сістэмы адукацыі працуе толькі невялікая група гімназій. Амаль 30% дыпломаў атрымалі навучэнцы трох мінскіх гімназій — 1-й, 41-й і 29-й. А ўвогуле больш за палову ўсіх дыпломаў (54,3%) былі заваяваны навучэнцамі дзесяці гарадскіх гімназій.

— Вывучэнне рэйтынгу гімназій за апошнія гады акрэсліла кола ўстаноў, якія па шэрагу пазіцый далёка адсталі ад групы лідараў. І, што нас асабліва трывожыць, з такім становішчам спраў там змірыліся або страцілі здольнасць аб'ектыўна сябе ацэньваць, — з сумам канстатаваў Міхаіл Мірончык.

Як утрымаць інтэлектуальную эліту?

На думку старшыні Камітэта па адукацыі, рэзервы для захавання і ўмацавання вынікаў работы з адоранымі дзецьмі ёсць. Па-першае, трэба ствараць максімальна спрыяльныя ўмовы для развіцця адораных дзяцей менавіта ў сценах той установы адукацыі, дзе заўважылі і выгадавалі талент, каб яны і на трэцяй ступені навучання бачылі перспектывы для свайго развіцця, адчувалі сваю значнасць і запатрабаванасць. Вось тут і патрэбны індывідуальныя адукацыйныя траекторыі, індывідуальны падыход і тэхналогіі індывідуальнага навучання. СТАР. 7

На чым прысягаюць украінскія прэзідэнты і навошта славенцам лыжны слоўнік?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадстаўнікі Чэхіі прапанавалі сваё бачанне нашай радзімы. У Карлавым універсітэце — галоўным у Празе — нядаўна выйшла кніга «Чэшскае ўсведамленне Беларусі». Сярод 30 яе аўтараў 9 чэхаў і 21 беларус. Кіраўнік дэлегацыі Юрый Марван надзвычай ганарыцца ёй і лічыць важнай для ўмацавання культурнай сувязі абедзвюх краін.

Ян Дулар са Славеніі паказаў карэспандэнту «Звязды» выданне, прысвечанае моўным праблемам, якіх дастаткова і на яго радзіме. Справа ў тым, што пасля распаду Югаславіі з'явілася некалькі новых краін — Сербія, Чарнагорыя, Славенія, Харватыя, Боснія і Герцагавіна, Македонія. І ўсе яны зараз праводзяць уласную моўную палітыку. Складанасць заключаецца ў тым, што дакументы для стасункаў з Еўрасаюзам, для іншых мэт даводзіцца перакладаць на кожную мову асобна. Гэта датычыцца і ўсяго астатняга, створанага на нацыянальных мовах. Бо краіны-суседкі не зусім разумеюць адна адну. Пры неабходнасці іх прадстаўнікі карыстаюцца сумесю англійскай і сербахарвацкай. Цікавінка ў тым, што славенец серба зразумее, а серб славенца не. Чаму? Таму што ў Славеніі ў школах вывучаюць сербскую мову, а ў Сербіі ж славенская не ўваходзіць у курс сярэдняй адукацыі. Зразумела, што пры такой моўнай сітуацыі на выставе кніг быў прадстаўлены і слоўнік новай лексікі Славеніі за апошнія 20 гадоў. Ян Дулар прывёў прыклады новых слоў. Камп'ютар яны зараз называюць «рачунальнік», што даслоўна перакладаецца як «складанне, матэматыка». Дыск мае назву «згошчэнка» («сціснутая інфармацыя»). Новыя словы даволі добра прыжыліся і ўвайшлі ў актыўны ўжытак.

Самым адметным выданнем гэтай краіны ўсё ж стаў... лыжны слоўнік. Прычым разлічаны ён не на спецыялістаў, а на шырокую аўдыторыю. Бо ў Славеніі лыжы — любімы ўсімі ад адпачынку. Адразу падумалася, а што б такое выдаць пра Беларусь, што аб'ядноўвала б і выклікала прыхільнасць усёй нацыі?

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Любімы горад

Не ўзрост, а пачатак шляху

Дэпутат любога ўзроўню заўсёды працуе з людзьмі і для людзей. Бо толькі на сустрэчах з выбаршчыкамі можна адчуць пульс сапраўднага жыцця, зразумець мары, надзеі і спадзяванні тваіх суайчыннікаў, даведацца пра іх праблемы і знайсці шляхі іх вырашэння, абмеркаваць важныя моманты функцыянавання рэгіёна.

Чалавеку неабходна, каб яго ўважліва выслухалі, у сумесным дыялогу вызначылі сутнасць праблемы, адшукалі выйсце з нялёгкай сітуацыі. Асабліва прыемна, калі выбаршчыкі прыходзяць са словамі падзякі ў адрас раённых, абласных улад ці вышэйшых службовых асоб. Пазітыўную ацэнку рабоце райвыканкама і райсавета даюць у Салігорскім раёне. Напэўна, гэта невыпадкова. Паспрабую абгрунтаваць сваё меркаванне.

...Лёс звязаў мяне са сталіцай беларускіх шахцёраў 35 гадоў таму. У Салігорскі раён, невялікую вёсачку Чэланец мяне адправілі працаваць сельскай настаўніцай пасля заканчэння педагагічнага вучылішча. Я і сёння памятаю, як упершыню ўбачыла тэрыконы і копры шахт. Ды і сам горад калійшчыкаў уразіў мяне сваёй кампактнасцю і прадуманасцю.

Тады я яшчэ не ведала, што з Салігорскам мяне звяжуць тысячы нітак і я з поўным правам буду лічыць яго сваёй другой радзімай. І, нават пражыўшы больш за дзесяць гадоў у Мінску, заўсёды з асаблівымі пачуццямі пад'язджаю да салігорскіх тэрыконаў.

Хутка сталіца беларускіх шахцёраў адзначыць свой 55-ы юбілейны дзень нарадзінаў. Як гісторык, добра разумею, што для горада гэта не ўзрост, а толькі пачатак шляху. Аднак кожная з 55 старонак гісторыі Салігорска напоўнена слаўнымі справамі. Сёння Салігорск сустракае сваіх гасцей яркімі фасадамі, добраўпарадкаванымі вуліцамі і новымі мікрараёнамі. Гэта не проста словы. Мне ёсць з чым параўноўваць і на падставе чаго рабіць высновы. Дзесяць гадоў я працавала начальнікам упраўлення адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. За гэты час аб'ехала ўсе гарады, сельскія населеныя пункты сталічнага рэгіёна. Добра разумела, што павінна ўсё ўбачыць на свае вочы, а пасля даць усяму ацэнку. Галоўная выснова, якую магу сёння зрабіць, наступная: парадак заўсёды там, дзе ёсць неабыякавы кіраўнік. У гаспадарчага дырэктара ўстановы адукацыі і клумбы квітнеюць, і ў сталовай усё на належным узроўні, і ў кацельні парадак, і вучэбна-выхаваўчы працэс адладжаны, як гадзіннік.

Гэты тэзіс справядлівы і для рэгіёнаў. У 2007 годзе ўказам Прэзідэнта нашай краіны горад Салігорск і Салігорскі раён былі аб'яднаны ў адну тэрытарыяльную адзінку. Так, буйны прамысловы цэнтр і сярэдні аграрны раён атрымалі другое дыханне. І вынікі не прымусілі сябе чакаць. За калійшчыкамі, чыя прадукцыя паляпшае ўраджайнасць хлебных ніў у многіх краінах свету, пачалі падцягвацца і салігорскія сельгасвытворцы.

За апошнія пяць гадоў яны атрымліваюць ураджаі, да якіх смела можна дадаць прыметнік «рэкордныя». Сёння цяжка паверыць, што ў 2008 годзе аграрыі Салігорскага раёна ўпершыню атрымалі ўраджайнасць у 100 тысяч тон збожжавых. Тады гэта сапраўды была перамога. Перамога над умовамі надвор'я, над сабой, але галоўнае, гэтая перамога дазволіла паверыць у сябе. Сёння ў Салігорскага раёна новая мэта — 200 тысяч тон збожжавых. І яна, безумоўна, будзе дасягнута. Таму што ёсць арыенцір, ёсць неабходная тэхніка (чаго варты той факт, што за пяць гадоў на 80% абноўлены сельскагаспадарчы парк!).

Пяць гадоў таму сталіца беларускіх шахцёраў атрымала ў падарунак спартыўна-відовішчны комплекс з лядовай арэнай, а таксама «Парк чатырох стыхій». Былі добраўпарадкаваны многія тэрыторыі, праведзена рэканструкцыя на праспекце Міра, вуліцах Леніна і Казлова, бульвары Шахцёраў. І вось новы юбілей — 55-годдзе. Салігорск атрымаў у падарунак абноўленую вуліцу Кастрычніцкую. Амаль тры гады і сорак мільярдаў рублёў спатрэбілася будаўнікам для яе рэканструкцыі.

У хуткім часе такімі ж стануць у шахцёрскім горадзе вуліцы Набярэжная, Васкрасенская, Падольская і іншыя, значная частка 15-га мікрараёна і ўвесь 5-ы Мікрараён. Там поўным ходам ідзе абнаўленне... Але самы галоўны падарунак атрымаюць жыхары новых салігорскіх мікрараёнаў. Гэта будзе вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы садсярэдняя школа, які гасцінна расчыніць свае дзверы для 720 школьнікаў і 320 дашкалят. З бюджэту на гэтыя мэты выдзелена 100 мільярдаў рублёў, большая частка з якіх ужо засвоена будаўнікамі.

А яшчэ ў Салігорску будуюць гіпермаркеты. Цяпер сюды па пакупкі едуць з бліжэйшых раёнаў. Чаму? Таму што з'явілася канкурэнцыя. Работнікі гандлю прыцягваюць пакупнікоў шырокім асартыментам тавараў, рознымі акцыямі, зніжкамі, пашырэннем відаў прадукцыі ўласнай вытворчасці. У гараджан зараз ёсць выбар! Нехта па звычцы ходзіць на рынак або ў бліжэйшы да дома магазін, хтосьці спяшаецца ў супермаркет, які спецыялізуецца на продажы рыбы і морапрадуктаў, а іншы адпраўляецца ў гіпермаркет, які робіць стаўку на здаровае харчаванне. Зараз і ў Салігорску могуць задаволіць запыты самых патрабавальных пакупнікоў.

Чаму ўсё гэта стала магчымым? Таму што ў Салігорску, на мой погляд, сфарміравана каманда сапраўдных прафесіяналаў-кіраўнікоў. Ведаю, што ў першы год сумеснай працы старшыня Салігорскага райвыканкама Аляксандр Рымашэўскі і старшыня Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзія Клішэвіч аб'ехалі ўсе сельскія населеныя пункты (а іх 168!). Пасля гэтага разам абмеркавалі, як наводзіць парадак на зямлі і як добраўпарадкоўваць гэтыя вёскі, многія з якіх сёння ўжо называюцца аграгарадкамі.

Ведаю, якую вялікую дапамогу раённым уладам аказваюць працоўныя калектывы буйных салігорскіх прадпрыемстваў, і ў першую чаргу, гэта адкрытае акцыянернае таварыства «Беларуськалій», вытворчы гігант не толькі Салігорска, але і ўсёй Беларусі.

Салігорску — 55. Шмат ужо зроблена. Але наперадзе — новыя гарызонты. Няхай усе мары стануць рэальнасцю, а кожны год дадае ў кнігу гісторыі і жыцця сталіцы шахцёраў новую слаўную старонку. І няхай салігорцы заўсёды ганарацца сваім горадам, які яны па праве лічаць лепшым на зямлі.

Таіса ДАНІЛЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы.

■ Надвор'е

ПАХАЛАДАЕ І ДАЖДЖЫ

У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, таму ў многіх раёнах чакаюцца дажджы і месцамі навальніцы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Пры навальніцах узмацненне ветру, парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўдзень 15-21 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 23 градусаў. Ужо ў суботу дажджы будуць пераважна па поўначы Беларусі. Месцамі чакаюцца моцныя ападкі, а ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Раніцай і ўначы слабы туман.Тэмпература паветра ў ноч на суботу плюс 7-14 градусаў, удзень — ад 14 да 19 цяпла, а па паўднёвым захадзе Беларусі — плюс 20-23 градусы. Будзе халаднавата і ў нядзелю. Уначы месцамі, а ўдзень амаль паўсюдна пройдуць непрацяглыя дажджы і навальніцы. Раніцай і ноччу ў асобных раёнах туман. У ноч на нядзелю тэмпературны фон знізіцца да 5 цяпла па паўднёвым захадзе, да плюс 13 градусаў па паўночным усходзе краіны, удзень — 15-20, а па Брэсцкай і Гомельскай абласцях да 22 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак атмасферны ціск будзе павялічвацца, але свежае паветра з боку Балтыйскага мора прынясе нам непрацяглыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ў ноч на панядзелак 5-12, удзень — 17-23 цяпла, на поўдні краіны — да плюс 25 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ

■

РЭКОРДНЫ ВЫНІК

Экіпаж з Александрыі намалаціў 6 тысяч тон збожжа. Гэта рэкордны вынік для Магілёўскай вобласці і пакуль што лепшы ў краіне, каментуюць у абласным камітэце прафсаюзаў работнікаў аграпрамысловага комплексу.

Фота БЕЛТА.

Экіпаж з адкрытага акцыянернага таварыства «Александрыйскае» Шклоўскага раёна, які яшчэ толькі днямі віншавалі з намалотам збожжа ў 5 тысяч тон, перасягнуў мяжу ў 6 тысяч тон. Міхаіл і Сяргей Байдаковы — бацька і сын. Міхаіл — ураджэнец Шклоўшчыны, усё жыццё працуе ў сельскай гаспадарцы, а яго сыну Сяргею толькі 19 гадоў, і ён навучэнец агралесатэхнічнага каледжа. Тым не менш, і Сяргей — вопытны ўдзельнік жніва, бо дапамагае бацьку на камбайне ўжо 8-ы сезон. Разам з гэтым экіпажам спраўна папрацаваў і вадзіцель Дзяніс Латыпаў, які штогод падчас уборачнай кампаніі паспяхова перасаджваецца з аўтамабіля дырэктара «Александрыйскага» на грузавы «МАЗ» з прычэпам.

Яшчэ адзін сямейны экіпаж з агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна ў складзе бацькі і сына (Уладзіміра і Дзмітрыя Мельнікавых) таксама паказаў добры вынік жніва — амаль 4,5 тысячы тон намалоту.

Жніво яшчэ працягваецца, хаця Магілёўская вобласць паступова набліжаецца да яго завяршэння: засталося ўбраць менш за 2% пасяўных плошчаў. Намалочана больш за 1 мільён 100 тысяч тон збожжа пры ўраджайнасці крыху вышэй за 37 цэнтнераў з гектара. Магілёўшчына мае трэці вынік у краіне па агульным намалоце і другі па ўраджайнасці.

Ілона ІВАНОВА.

КВАДРАТНЫ МЕТР ПАЙШОЎ УГОРУ І Ў РЭГІЁНАХ

Віцебскае падаражанне мае і расійскі след

З першых дзён года працягваецца павелічэнне попыту на ўсе віды жылля і ў паўночным рэгіёне. Толькі за апошні месяц аднапакаёвыя кватэры ў горадзе на Заходняй Дзвіне падаражэлі адразу на 2—3 тысячы долараў, паведаміў нам **дырэктар Віцебскага агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг Уладзімір КАБАНАЎ.**

Невялікія аднапакаёвыя «хрушчоўкі» зараз прапануюцца кліентам за 30—33 тысячы долараў. Стандартныя кватэры агульнай плошчай 38—39 кв. метраў каштуюць цяпер прыкладна 41—42 тысячы долараў. У элітных дамах кошт якасных аднапакаёвак пачынаецца з 50 тысяч долараў і да бясконцасці. Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» (43—45 кв. м) у старых дамах каштуюць каля 41—42 тысяч долараў. І на такое жыллё выбар у Віцебску мінімальны. Больш прасторныя двухпакаёвыя кватэры новай планіроўкі і плошчай каля 50 кв. метраў каштуюць у межах 51—52 тысяч долараў. Нягледзячы на сур'ёзны кошт «квадрата», такіх кватэр у продажы амаль не засталося. А вось попыт на старыя трохпакаёўкі зараз не такі вялікі, таму і падаражэлі яны значна менш. Трохпакаёвыя «хрушчоўкі» (каля 58 кв. метраў) прапануюцца прыкладна за 50 тысяч долараў, а «троечкі» новай планіроўкі каштуюць ад 60 тысяч і даражэй за памяшканні плошчай 64 кв. метры.

Уладзімір Кабанаў адзначае, што пік продажу кватэр на другасным рынку Віцебска назіраўся ў ліпені, калі адначасова прапаноўвалася каля 700 аб'ектаў нерухомасці. Зараз на рынку засталося толькі прыкладна 400 аб'ектаў жылля, бо асобныя прадаўцы знялі свае кватэры з продажу, каб пазней рэалізаваць іх ужо даражэй.

Гэтым летам у Віцебскім рэгіёне пачала мацней акрэслівацца тэндэнцыя набыцця жылля расіянамі. Грамадзяне суседняй дзяржавы купляюць тут кватэры і асобныя дамы амаль без торгу, чым правакуюць далейшае павелічэнне цэннікаў.

Даволі актыўна цяпер набываюцца прыватныя дамы і катэджы як у Віцебску, так і ў бліжэйшым прыгарадзе. Рэальны кошт такога жылля зараз складае ад 80 да 200 тысяч долараў.

Пры існуючым максімальным попыце жыллё ў Віцебску будзе даражэць і надалей. Кіраўнік дзяржаўнага агенцтва прагназуе, што ўжо да снежня цэннікі на кватэры ў гэтым абласным цэнтры пацяжэюць яшчэ на 10—15 працэнтаў. Спецыяліст тлумачыць свой прагноз тым, што новае долевае будаўніцтва ў горадзе амаль цалкам спынілася, пасля чаго людзі сталі больш увагі надаваць менавіта другаснаму рынку жылля.

Цэны ў Гродне дыктуе мясцовы забудоўшчык

Павышаны попыт на жыллё ў гэтым горадзе акрэсліўся з пачатку вясны, тады і цэны на нерухомасць сталі павялічвацца.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А ўсё пачалося з таго моманту, як магутны мясцовы забудоўшчык, таварыства «Гроднажылбуд», выставіў у свабодны продаж кватэры ў новым доме прэстыжнага раёна па кошце 1000 долараў за квадратны метр. І гэта былі кватэры без аддзелкі. Людзі адразу зразумелі, што таннага жылля ўжо не будзе, таму і пачалі павялічваць цэннікі на сваё старое жыллё. Псіхалагічны фактар спрацаваў проста выдатна: зараз попыт перавышае жыллёвую прапанову больш чым у 2—3 разы.

Праўда, галоўны забудоўшчык горада актыўна будуе жыллё і на ўскрайку абласнога цэнтра па кошце квадратнага метра да 700—800 долараў. Менавіта таму «слабенькія» кватэры ў старых дамах падаражэлі яшчэ не максімальна.

Статыстыка сведчыць, што за апошнія 2—3 месяцы стандартныя кватэры ў Магілёве падаражэлі на 10—12 працэнтаў. Самыя «слабенькія» аднапакаёўкі (30—31 кв. метр) зараз тут каштуюць 25 тысяч долараў.

Як паведаміў **кіраўнік дзяржаўнага агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг г. Гродна Валяр'ян СТОКА,** мінімальны кошт аднапакаёвых «хрушчовак» (31 кв. м) тут складае 26 тысяч долараў. Падобныя па плошчы (32 кв. м) «брэжнеўкі» каштуюць ужо ад 29 да 32 тысяч долараў, а стандартныя аднапакаёўкі ў панэльных дамах (каля 42 кв. м) прапануюцца кліентам за 33—35 тысяч долараў.

Не вельмі дорага прадаюць у Гродне і двухпакаёвыя «хрушчоўкі» агульнай плошчай 44 кв. метры — за 32—34 тысячы долараў. Стандартныя двухпакаёўкі плошчай каля 56 кв. метраў прапануюцца, у залежнасці ад якасці, ад 41 да 45 тысяч долараў. Існуюць на рынку і элітныя двухпакаёвыя кватэры з кухняй за 12 метраў. Такое жылое памяшканне з рамонтам і агульнай плошчай 58 кв. метраў мае рэальны цэннік ад 67 да 69 тысяч долараў.

Прысутнічаюць на рынку Гродна зусім маленькія па плошчы (45—48 кв. метраў) трохпакаёвыя кватэры. Такое жыллё мае кодавую назву «распашонка-брэжнеўка» і каштуе ад 39 да 42 тысяч долараў. Трохпакаёўкі (56—57 кв. м) у панэльных дамах выстаўлены на продаж за 50 тысяч долараў і даражэй. Так званыя «чэшкі» плошчай ад 73 да 80 кв. метраў каштуюць мінімум 70 тысяч долараў.

Кіраўнік дзяржаўнага агенцтва нерухомасці паведаміў нам, што жыллё на другасным рынку Гродна за вясну і лета падаражэла прыкладна на 12—15 працэнтаў. Далей цэннікі будуць павялічвацца ўжо не так істотна. Да канца года яны могуць прыплюсаваць яшчэ 4—6 працэнтаў, але не больш, лічыць Валяр'ян Стока.

У Гомелі цэнамі кіруе дэфіцыт

Да апошняга часу кватэры ў гэтым горадзе каштавалі значна менш, чым у іншых абласных цэнтрах краіны. Існуючыя тэндэнцыі такую сітуацыю хутка зменяць.

Не, попыт на жыллё ў Гомелі не такі і вялікі, але вельмі слабая прапанова і адсутнасць рэальнага выбару стварае ідэальныя ўмовы для штучнага павелічэння цэн. Менавіта з-за гэтага дэфіцыту прадаўцы кватэр павялічваюць цэннікі і трымаюцца за іх да апошняга.

Вось цэны і папаўзлі ўгору. А другога выйсця ў кліентаў ужо няма, бо апошнім часам долевае будаўніцтва ў рэгіёне ўвогуле не дзейнічае, расказвае пра сітуацыю **намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алеся КУЧЫНСКАЯ.**

Менавіта таму зусім «слабенькія» аднапакаёвыя «хрушчоўкі» (да 31 кв. м) каштуюць ужо 25 тысяч долараў. У панэльных дамах маленькія аднапакаёўкі (34 кв. м) прапануюцца мінімум за 28—30 тысяч долараў. Кватэры з палепшанай планіроўкай прымальных плошчаў (36—42 кв. м) у «свежых» дамах (да 10 гадоў з часу пабудовы) каштуюць і ўвогуле ад 35 да 50 тысяч долараў. Атрымліваецца, што ў такіх кватэрах кошт жыллёвага «квадрата» дасягае 1000—1100 долараў.

Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» плошчай каля 38 кв. метраў маюць мінімальны кошт ад 32 тысяч долараў. Такія сярэднія па плошчы двухпакаёўкі (да 50 кв. м) маюць цэннік ад 37 да 40 тысяч долараў. Двухпакаёвыя «чэшкі» з кухняй 10 «квадратаў» і агульнай плошчай каля 54 кв. метраў каштуюць зараз не менш як 50 тысяч долараў.

Самыя танныя трохпакаёўкі (54 кв. м) з сумежнымі пакоямі нават увогуле без рамонту каштуюць 47—48 тысяч «зялёных». Тыпавая трохпакаёвая «панэлька» агульнай плошчай каля 65 квадратных метраў «цягне» зараз ужо 50—55 тысяч долараў. Сучасныя трохпакаёўкі ў цагляным ці маналітным доме з агульнай плошчай у межах 68—85 кв. метраў прапануюцца за 65—75 тысяч, а з добрым рамонтам — і за 80—90 тысяч долараў.

Гэтым летам у Віцебскім рэгіёне пачала мацней акрэслівацца тэндэнцыя набыцця жылля расіянамі. Грамадзяне суседняй дзяржавы купляюць тут кватэры і асобныя дамы амаль без торгу, чым правакуюць далейшае павелічэнне цэннікаў.

Алеся Кучынская паведаміла рэдакцыі, што жыллё ў Гомелі пачало даражэць яшчэ ў лістападзе мінулага года. За гэты час цэннікі на кватэры прыплюсавалі ажно 35—40 працэнтаў ад першапачатковага кошту.

Спадарыня Алеся адзначыла, што камерцыйнае жыллё ў горадзе будуецца ў вельмі маленькіх аб'ёмах, таму яно даволі дарагое. Двухпакаёвыя кватэры без аддзелкі там каштуюць каля 65 тысяч долараў, калі за квадратны метр трэба заплаціць тысячу долараў. Будуецца адзін дом у цэнтры горада, дзе кватэры каштуюць з разліку 1300 долараў за квадратны метр.

Не вельмі радасная сітуацыя на першасным рынку жылля прымушае людзей купляць кватэры ў прыватным парадку. А кватэр на рынку не хапае, што і правакуе штучнае павелічэнне цэн. Таму наш эксперт лічыць, што за верасень—кастрычнік цэны на стандартнае жыллё ў горадзе могуць павялічыцца яшчэ на 5—7 працэнтаў, а да новага года — нават да 15 працэнтаў.

Гэтым летам актыўна прапануюцца на продаж не вельмі шыкоўныя катэджы (плошчай да 100 кв. м) па кошце ад 70 да 80 тысяч долараў. А вось звычайны жылы дом у добрым раёне горада на 10 сотках зямлі прапануецца кліентам за 50—60 тысяч долараў. Існуюць у продажы старыя, але яшчэ трывалыя жылыя дамы з агульнай плошчай каля 50 кв. метраў. Такі аб'ект нерухомасці на 6 сотках зямлі каштуе каля 30 тысяч долараў і нават менш. Існуюць выпадкі, калі падобны дом прадаюць нават за 15—20 тысяч долараў. Такое жыллё зараз не даражэе. Зніжкі ў час таргоў дасягаюць 3—4 тысяч USD.

Паляванне на танныя аднапакаёўкі ў Магілёве

На другасным рынку гэтага горада жыллёвай нерухомасцю кліенты пачалі сур'ёзна цікавіцца толькі ў сярэдзіне сакавіка. Павялічылася колькасць зарэгістраваных здзелак, і цэны на кватэры пачалі рухацца ўгору, паведаміла рэдакцыі **дырэктар Магілёўскага агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг Алена АРЦЫКАВА.**

У гэтай актывізацыі пакупнікоў ёсць пэўная асаблівасць. Кліенты шукаюць і купляюць толькі самае таннае жыллё: галоўным чынам, гэта аднапакаёвыя кватэры, якія патрабуюць рамонту. Тут людзі з грашыма набывалі кватэры не для ўласнага пражывання, а каб правільна ўкласці грошы. Менавіта таму большасць таннага жылля ўжо і павымывана з рынку.

Статыстыка сведчыць, што за апошнія 2—3 месяцы стандартныя кватэры ў Магілёве падаражэлі на 10—12 працэнтаў. Самыя «слабенькія» аднапакаёўкі (30—31 кв. метр) зараз тут каштуюць 25 тысяч долараў. У панэльных дамах кватэры плошчай 36 кв. метраў каштуюць ужо 32—33 тысячы долараў. А вось аднапакаёўкі палепшанай планіроўкі плошчай каля 40—50 квадратных метраў прапануюцца пакупнікам ужо за 41—52 тысячы долараў.

Двухпакаёвая «хрушчоўка» ў спальным раёне Магілёва ацэньваецца ў межах 33—35 тысяч долараў. Звычайныя кватэры плошчай да 52—55 кв. метраў у панэльных дамах каштуюць ужо 42—45 тысяч долараў.

Сапраўды таннымі з'яўляюцца, па мінскіх мерках, мясцовыя трохпакаёвыя «хрушчоўкі» (54—55 кв. метраў), якія каштуюць ад 40 да 42 тысяч долараў. Стандартныя кватэры плошчай 66—67 квадратных метраў каштуюць усяго 50—52 тысячы долараў.

Алена Арцыкава ўпэўнена, што восенню попыт традыцыйна павялічваецца на ўсе тыпы кватэр. Таму да лістапада—снежня ліквідныя кватэры могуць падаражэць яшчэ на 7—8 працэнтаў.

Гэтым летам на другасным рынку Магілёва акрэслілася новая тэндэнцыя, якая тычыцца прыватнага сектара. Зараз назіраецца істотнае павелічэнне прапановы асобных жылых дамоў. Гэта звычайна цагляныя ці драўляныя дамы 1950—1970-х гадоў пабудовы, дзе жылая плошча складае 50—65 квадратных метраў. Сярэдні кошт такіх дамоў на зямельных участках у межах горада складае каля 40—50 тысяч долараў, аднак хапае і зусім «слабенькіх» дамоў пад знос за 10—15 тысяч долараў. Прапанова ў прыватным сектары павялічылася, аднак попыт на такія несучасныя аб'екты цяпер мінімальны. Такія дамы зараз прадаюць дзеці памерлых бацькоў. Так, маладыя прывыклі жыць у камфортных умовах, і агароды ім не патрэбны. Трывалыя і якасныя катэджы тут каштуюць ад 100 да 150 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

У абласных цэнтрах катастрафічна не хапае прыватнай арэнды

Пра даволі складаную сітуацыю ў сферы прыватнай арэнды расказваюць спецыялісты агенцтваў нерухомасці ўсіх рэгіёнаў Беларусі.

У тых гарадах, дзе прысутнічае моцны мясцовы забудоўшчык, які ўзводзіць не толькі бюджэтнае жыллё для чаргавікоў, але і займаецца долевым будаўніцтвам, сітуацыя крыху лепшае, аднак... Існуе агульная тэндэнцыя, калі буйныя гандлёвыя і іншыя арганізацыі абласных цэнтраў запрашаюць для цяжкай, але высокааплатнай працы работнікаў з перыферыі. Такія работнікі шукаюць прыватнае жыллё. Вось і адбываецца дадатковы ціск на рынак арэнды. А пры ажыятажным попыце цэны растуць. Існуе тут і яшчэ адзін фактар, аб якім мы раскажам крыху пазней.

Амаль самым «танным» рэгіянальным цэнтрам па лініі прыватнай арэнды з'яўляецца Гродна. Тут без вялікіх праблем магчыма знайсці даволі салідную аднапакаёўку за 120—150 долараў за месяц. Яшчэ зімой цэннік такой паслугі пачынаўся з 90—100 долараў. А зараз у лепшых раёнах горада двух- і трохпакаёвыя кватэры здаюцца за 250 долараў. Гэта таму, што арэнднага жылля для ўсіх не хапае. Дэфіцыт і ўсё.

А вось самы маленькі цэннік па арэндзе прысутнічае ў Магілёве. Тут у спальных раёнах аднапакаёўка каштуе 120—130 долараў, а калі актыўна пашукаць самастойна, то можна знайсці і за 100 долараў. Двухпакаёўкі здаюцца за 160 долараў. Арэнднага жылля і тут не хапае, але попыт пакуль не максімальны, ён толькі набірае вагу.

Даволі вялікі попыт на асобныя жылыя памяшканні прысутнічае ў Віцебску. Больш за ўсіх з-за гэтага пакутуюць мясцовыя студэнты. Каб зняць любую аднапакаёўку ў гэтым горадзе, неабходна заплаціць 150 долараў плюс камунальныя. Цэннік на двухпакаёўкі пачынаецца з 200 долараў.

Неверагодна, але факт. У Гомелі цэннік прыватнай арэнды самы высокі сярод рэгіянальных цэнтраў — праўда, пасля Брэста. Намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алеся Кучынская адзначае, што такога складанага становішча, як цяпер, не было на рынку ніколі. Арэнднага жылля не хапае катастрафічна. Попыт перавышае прапанову ў 3—5 разоў. Калі ў студзені двухпакаёвую кватэру можна было адшукаць за 120 долараў, то сёння цэннік арэнды аднапакаёвых кватэр пачынаецца са 150 долараў. Больш-менш «упакаваныя» аднапакаёўкі прапануюць кліентам за 170 і нават за 180 долараў.

Цяпер гаспадары жылля адчуваюць сябе нейкімі азіяцкімі царкамі і карыстаюцца сітуацыяй напоўніцу. Такія дамарошчаныя прадпрымальнікі арганізуюць аўкцыёны сярод будучых кватарантаў, патрабуюць ад іх перадаплату за 6 месяцаў ці нават за год. Амаль ніхто не хоча звязвацца са студэнтамі, сем'ямі з малымі дзецьмі, з маладымі сем'ямі без афіцыйнай рэгістрацыі ці без мясцовай прапіскі. І яшчэ шмат чаго.

Бываюць выпадкі, калі ўласнікі здымных кватэр, робяць з іх прыватны інтэрнат. Тады здаецца не асобная кватэра аднаму кліенту (сям'і), а прапануецца ложка-месца ў кватэры адразу некалькім незнаёмым людзям. Так, цяпер аднапакаёвую кватэру можна здаць адразу 2—3 чалавекам і атрымаць за арэнду ўжо не 150, а 200 ці нават 300 долараў.

На гэтым ажыятажным попыце асобныя людзі сталі рэальна «секчы капусту». А ўвогуле шмат кватэр у горадзе здаецца на суткі.

З «якога боку» з'явіўся на рынку дысбаланс попыту і прапановы? Спадарыня Алеся тлумачыць гэта ў тым ліку і тым, што летась існавала забарона на арэнду кватэр, якія былі пабудаваны з выкарыстаннем ільготных крэдытаў. Калі ў сталіцы доля такіх арэндных кватэр складала каля 5—7 працэнтаў, то ў Гомелі і ў іншых рэгіянальных цэнтрах яна дасягала 40 і больш працэнтаў ад агульнай колькасці здымных памяшканняў. Людзям забаранілі зарабляць грошы на арэндзе такога жылля, але дзяржаўных арэндных дамоў пакуль не пабудавана ў неабходнай колькасці. Дык каму ад гэтага стала лепш? Можа, той маладой сям'і, якая цяпер стане плаціць за арэнду значна больш? Нешта тут не састыкоўваецца...

У Брэсце складваецца ўвогуле парадаксальная сітуацыя. У агенцтвах нерухомасці бюджэтных здымных кватэр амаль няма. Таму тут арэнда аднапакаёўкі пачынаецца з 200 долараў, а двухпакаёўкі каштуюць ужо 250—270 долараў. Але нават і па такім цэнніку здымнага жылля катастрафічна не хапае. Спецыялісты падлічылі, што за 4 апошнія месяцы арэнда стандартных невялікіх кватэр падаражэла на 50—60 долараў.

Сяргей ПАЛІНІН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Медыяперсона

Крысціна КОЗЕЛ:

«КАЛІ НА ПОЛІ З'ЯЎЛЯЮЦЦА КАМАНДЫ, У МЯНЕ НАВАРОЧВАЮЦЦА СЛЁЗЫ»

Футбол — яе стыхія. Насуперак усім стэрэатыпам, быццам не жаночая гэта сфера, яна не пабаялася заявіць пра свой інтарэс і пацвердзіць яго прафесіяналізмам у працы. І вось цяпер у тых, хто паверыў аднойчы ў Крысціну Козел, ёсць магчымасць чытаць яе матэрыялы на старонках газеты «Усё пра футбол», а таксама глядзець і слухаць у аўтарскай праграме «Козел пра футбол» на ІнтэрнэтТБ Белтэлерадыёкампаніі. Пра тое, за што можна любіць беларускі футбол, як вырашыць праблему пустых трыбун і як выкарыстоўваць «кадравы» рэсурс, мы і паразважалі з Крысцінай падчас сустрэчы.

— Як даўно вы захапляецеся футболам?

— Дакладна сказаць не магу, але гэта працягваецца з таго часу, як я сябе памятаю. А прафесійна захапляюся футболам апошнія гады тры-чатыры. Відаць, бацька вельмі моцна чакаў сына, таму любоў да гэтага віду спорту перадалася і мне. Ён быў прыхільнікам-аматарам. Я і сёння, калі чую «цокат» бутсаў, прыгадваю дзяцінства. Мы з ім пастаянна наведвалі матчы, а потым я ўжо сама рабіла гэта. Калі нейкую гульню паказвалі па тэлевізары, пазначала яе на палях тэлепраграмы, каб не прапусціць, бо для мяне гэта было настолькі істотна і натуральна, як, напрыклад, для маці прагляд серыяла.

— А сябе не думалі паспрабаваць у гэтым відзе спорту?

— Футбол — гульня для мужчын. Калі гуляюць жанчыны, я не супраць. Але прыгожа, размашыста і лепш за мужчыну ніхто, на мой погляд, не выступіць на футбольным полі. Для мяне футбол — як тэатр, дзе не кожнаму дадзена іграць на сцэне, а вось паглядзець — можа любы ахвотны.

— Ведаю, што паралельна з захапленнем футболам вы займаліся музыкай і танцамі — гэта ўжо ўплыў маці?

— Не, таксама бацькі, хаця маці заўсёды ва ўсім падтрымлівала і падтрымлівае мяне. Тата прытрымліваўся меркавання, што дзіця трэба развіваць усебакова. Спачатку мяне аддалі на танцы. Яшчэ я вельмі хацела іграць на фартэпіяна, а ў маёй вёсцы было шмат ахвотных займацца на гэтым інструменце. Мы дачакаліся сваёй чаргі, і я ўсё ж такі трапіла ў музычную школу. І па сённяшні дзень музыка ў мяне паўсюль. Я нават для сваёй праграмы «Козел пра футбол» выбіраю музычнае суправаджэнне. Вось паглядзела матч і адразу ведаю, на якую мелодыю яго лепш пакласці.

— «Козел пра футбол» — аўтарскі праект. Як ён з'явіўся?

— У Белтэлерадыёкампанію я прыйшла праз кастынг. Кіраўніцтва ІнтэрнэтТБ заўважыла маё захапленне футболам і мне прапанавалі напісаць канцэпцыю праекта, які б адлюстроўваў маё бачанне падзей у гэтай тэме. Мы зрабілі стаўку на моладзь і на дынамічнасць падачы інфармацыі. Памятаю, пасля першай праграмы глядзела на колькасць паведамленняў з водгукамі і думала, што там, мабыць, шмат негатыўных рэакцый. А яны ўсе аказаліся станоўчымі. Потым мы стварылі групу ў сеціве, і, мяркуючы па колькасці падпісчыкаў, інтарэс да праекта ёсць. І тое, што ў нас маладая аўдыторыя, таксама плюс, бо чалавек з юнага ўзросту расце прывучаным да футбола.

Калі нейкую гульню паказвалі па тэлевізары, я пазначала яе на палях тэлепраграмы, каб не прапусціць, бо для мяне гэта было настолькі істотна і натуральна, як, напрыклад, для маці прагляд серыяла.

— Ці мае ваша творчая свабода нейкія рамкі і як на гэта рэагуе аўдыторыя?

20.30 Камедыя «Спатканне маёй мары».
23.00 «Ежа багоў».
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.
0.50 «Дым над вадой». Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.

МІР

5.00 Серыял «Агонь кахання».
6.40 Серыял «Арабела вяртаецца».
7.05 «Цік-так».
7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Маст. фільм «Замежны жаніх».
11.15 «Сардэчна запрашаем».
11.45 «Рэспубліка сёння».
12.25, 1.15 Серыял «Клон».
15.25 «Злачынства і пакаранне».
15.50 «Сакрэтныя матэрыялы».
16.20, 23.25 Серыял «Апошні сакрэт Майстра».
18.30 Дак. фільм «Паднятая Астана».
19.25 Маст. фільм «Мядовы месяц».
21.20 «Любімыя акцёры».
21.45 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».
3.45 «Цюркі Расіі».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Асаблівы выпадак».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.40 Серыял «Уцякаць».
13.50, 16.50, 19.50, 23.30 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «1000 дробязяў».
15.10 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.55 Серыял «Скліфасоўскі».
17.10 Серыял «Ефрасіння. Таежнае каханне».
18.00 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».
18.55 Серыял «Спадчынніца».
20.40, 23.40 Серыял «Шэф паліцыі».
0.20 Маст. фільм «Салодкая жанчына».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.10 Выратавальнікі.
8.45, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
12.00, 13.25 «Суд прысяжных».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.15 «Прафесія — рэпарцёр».
15.40, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.35 Серыял «Бамбіла. Працяг».
21.25 Ты не паверыш!
22.25 Маст. фільм «Майстар».
23.55 Серыял «Глухар. Вяртанне».
1.00 Камедыя «Масквічы».

8 КАНАЛ

7.00, 18.35, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
7.05 М/с «Ліга справядлівасці».
7.25, 14.15 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
9.35, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».
10.20 «Мой любімы гадаванец».
10.50, 18.40 Серыял «Песня лёду і полымя».
12.45 Трылер «Назіральнік».
16.05 Мультпарад.
16.30 «Адшукваецца адпалычнак».
17.00 Серыял «Тайныя сувязі».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Баявік «Квант міласэрнасці».
23.10 «Hip Show».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 14.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 17.30 «С.У.П.».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 19.00 Серыял «Метад Лаўровай».
11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».
12.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
13.00, 16.30, 0.00 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 17.00, 20.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.30, 23.30 «Улётнае відэа».
15.00 Серыял «Кадэцтва».
16.00, 18.30, 0.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
21.10 Серыял «Галыгін.ru».

ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 Раніца з ІНТЭРам.
9.10, 16.30, 4.00 Феерыя падарожжаў.
9.40 Серыял «Запарогі».
10.30, 16.55, 1.25 Сямейны суд.
11.15 Брама часу.
12.20 Рэчавы доказ.
12.50, 18.30, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.35, 23.20 Пазавочы.
14.20, 0.05 Не можа быць.
14.45, 0.30 Краіна смяецца.
15.00, 0.45 Судовыя справы.
15.40 Дак. серыял «Гонар краіны».
17.40, 4.20 Давай пажэнімся!
19.15, 2.15 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30 Канцэрт Ілы Рэзніка.
3.30 Смартшоу.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Валерый Прыёмыхаў. Дзве сустрэчы з працягам». Дак. фільм.
6.20 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
6.40, 12.40 «Рыжы сумленны закаханы». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час»
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Песня-83».
11.00 «Адамаў яблык». 1991 год.
12.00 «Ралі «Лада». Дак. фільм.
12.15 «Спецыяльна па вашым заказе». 1990 год.
17.00 «Будзільнік». 1988 год.
17.40 «Тэлескоп». 1995 год.
18.15 «Тэмп». Канцэрт.
18.50 «Мільён прыгод. Востраў іржавага генерала». Маст. фільм.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». 1988 год. 1-я частка.
23.00 «Пад знакам «Пі». 1990 год.
0.00 «Пошук ісціны». Дак. фільм.
0.25 «Маленькі канцэрт». 1991 год.
0.40 «Гульня ў дэтэктыў». Тэлеспектакль. 1987 год.
4.00 «Залаты дыск». Канцэрт Вячаслава Дабрыніна.

EUROSPORT

4.00, 11.00, 18.45, 22.05 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША.
8.00 Снукер. Еўрапейскі тур.
9.00 Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету. Фіналы.
14.00 Футбол. Жараб'ёўка Лігі Еўропы.
15.00 Веласпорт. World Ports Classic.
17.00 Веласпорт. Вуэльта.
22.00 Гейм, сэт і Матс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 5.40, 8.00, 8.25, 12.55, 13.20, 2.20, 2.45 Серыял «Месяцавы хлопчык».
6.15 Камедыя «Чалавек-аркестр».
7.40, 10.40, 13.45, 16.45, 21.50, 23.50, 1.50, 3.10 «Камедыянты. Лепшае».
9.00 Камедыя «Баламут».
11.15 Прыгоды «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода».
14.10 Камедыя «Бульварны пераплёт».

СУБОТА, 31 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.10 Маст. фільм «Той самы Мюнхгаўзен».
8.30 Існасць.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 Зямельнае пытанне.
9.40, 23.35 Серыял «Выратаваць боса».
10.45 Здароўе.
11.30 Усё як трэба!
12.10 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Мамчыны сынкі».
16.30 Каробка перадач.
17.05 Анімацыйны фільм «Гісторыя цацак».
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.15 Камедыя «Васількі для Васілісы».
21.00 Панарама.
21.40 Камедыя «Брус Усемагутны».
23.25 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.55 М/ф: «Халіф-бусел», «Старыя знаёмыя», «Геракл у Адмета».
8.55 Фільм-казка «Іван ды Мар'я».
10.20 Пазакласная гадзіна.
10.40, 20.55 Тэлебарометр.
10.45 Меладрама «Асабістае жыццё афіцыйных людзей». Заключныя серыі.
12.50 Пад грыфам «Вядомыя».
13.30 Дача здароўя.
14.05 Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
14.40 Меладрама «Нахабніца». 1-я і 2-я серыі.
16.45 Фільм-фэнтэзі «Рыжык у Залюстраркоўі». 1-я і 2-я серыі.
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.15 Вышэй за дах.
21.00 «КЕНО».
21.05 Камедыя «Стыльная штучка».
23.10 Драма «Апошні танец».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Таямніца душы».
8.30 Дзіцячы фільм. «Палёт у краіну пачвараў».
9.40 «У рэху імені твайго...». Барбара Радзівіл.
9.55 «Паданне пра Тураў». Дак. фільм.
10.25 «...Штрых... пункцір...». Дак. фільм.
11.05 «Крылатыя кошкі ночы». Навукова-папулярны фільм.
11.20 «Пяць дзён з жыцця генеральнага канструктара». Дак. фільм.
11.45 «Беларускі народны каляндар». Дзяды.
12.05 «Дарагія лялькі». Дак. фільм.
12.50 «Суседзі».
13.00 «АРТиШОК».
13.30, 0.05 «Эпоха. Падзеі і людзі».
14.10 Канцэрты ў Вялікай студыі Дома радыё. Гітарыст Павел Кухта.
15.30 «Я — дзяўчынка на шары...». Дак. фільм.
16.00 «Аксана Волкава. A prima vista». Дак. фільм.
16.25 «Іван Мележ. Туманы над багнаю». Дак. фільм.
16.55 «Георгій Жукаў. Вайна і мір Маршала Перамогі». Дак. фільм.
17.25 «Паспець да ночы». Фільм-партрэт.
17.55 «Гэты дзіўны свет...». Кампазітар і спявак Чэслаў Немен.
18.25 «Разуменне ў фарбах». Дак. фільм.
19.00, 20.45 «Вясна Мікельанджэла». Драма. 1-я і 2-я серыі.
20.30 Калыханка.
22.15 Сусветнае кіно. Маст. фільм «І святло ў цемры свеціць».

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 Серыял «Сінія ночы».
14.05 Ералаш.
14.15 Камедыя «Беражыся аўтамабіля».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Жадаю Вам...». Да юбілею Роберта Раждзественскага.
18.15 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
21.05 «Сёння ўвечары».
22.55 Драма «Доказ жыцця».

СТБ

6.30 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
8.10 Камедыя «Спатканне маёй мары».
10.10 «Чыстая праца».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.00 «Прыгоды дылетанта».
12.30 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».
14.50 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Пяты элемент».
22.30 «Зорны рынг». Дайджэст.
23.30 Маст. фільм «Дзеткі ў парадку».
1.15 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
8.05 «Мільён пытанняў пра прыроду».
8.20 «Эксперыментатары».
8.35 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 На шашлыкі.
9.40, 4.20 «Зроблена ў СССР».
10.05 Маст. фільм «Дарослыя дзеці».
11.25, 0.35 Серыял «Не пакідай мяне, каханне».
15.10 Серыял «Два колеры страсці».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Жадаю Вам...». Да юбілею Роберта Раждзественскага.
18.15 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
21.05 «Сёння ўвечары».
22.55 Драма «Доказ жыцця».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Шукаю цябе».
8.40 Маст. фільм «Сяброўкі».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55, 14.50 «Гарадок». Дайджэст.
12.40 Маст. фільм «Набытак рэспублікі». 1-я серыя.
14.15 «Сумленны дэтэктыў».
15.15 «Уцёкі ад смерці. Маргарыта Валодзіна».
16.15 Маст. фільм «Вучу гульні на гітары». 1-я серыя.
18.05 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.30 Маст. фільм «Каханне не дзеліцца на 2».
23.50 Маст. фільм «Маладыя».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Страхоўшчыкі».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Агляд».
8.50 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Следства вялі...».
14.10 «Вочная стаўка».
15.05 «Чыстасардэчнае прызнанне».
15.40 Баявік «Кодэкс гонару».
17.25 «З песні слоў не выкінеш!».
18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
19.50 Серыял «Версія-3».
23.20 Маст. фільм «Ельцын. Тры дні ў жніўні».
1.05 «Прывіды Дома Рамановых».

8 КАНАЛ

9.00, 13.40, 18.40, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.15 «На рыбалку».
9.30 Серыял «Песня лёду і полымя».
11.35 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.45 Меладрама «Якія блукаюць у каханні».
13.45 Трылер «Горад грахоў».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм-дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.20 «Hip Show».
17.50 Серыял «Людзі Альфа».
18.45 Драма «На адлегласці ўдару».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Пачатак».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 «Спатканне са смакам».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Сукенка маёй мары».
11.30, 17.00, 23.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
12.00, 21.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 21.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Амазонкі».
16.00 «Практычная магія».
18.00 «Нерэальная гісторыя».
19.00 «Уральскія пельмені».
22.10 «Кіно ў дэталях».

ІНТЭР+

6.00 Канцэрт Ілы Рэзніка.
8.50 Пазавочы.
9.40 Смартшоу.
10.10 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
10.55, 22.00 Летняя кухня.
11.40 Серыял «Кантор».
12.50 Феерыя падарожжаў.
13.15 Маст. фільм «Прынцэса на бабах».
15.00 Маст. фільм «Трэст, які лопнуў».
18.15, 23.45 Маст. фільм «Патрыятычная камедыя».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30, 1.30 Маст. фільм «Дзісай».
22.45 Дак. фільм «Ірына Алегрова. Сыходжу, каб вярнуцца».
23.30 Краіна смяецца.
3.30 Маст. фільм «Трэст, які лопнуў».

НАСТАЛЬГІЯ

5.05 «Адамаў яблык». 1991 год.
6.00 «Ралі «Лада». Дак. фільм.
6.15 «Спецыяльна па вашым заказе». 1990 год.
6.40, 0.40 «Рыжы сумленны закаханы». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 2.00 «Час»
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Песня-83».
11.00 «Будзільнік». 1988 год.
11.40 «Тэлескоп». 1995 год.
12.15 «Тэмп». Канцэрт.
12.50 «Мільён прыгод. Востраў іржавага генерала». Маст. фільм.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». 1988 год.
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.10 «Пад знакам задыяка. Дзева». 1992 год.
19.45 «Шынок 13 крэслаў». 1973 год.
21.00 «Таблетку пад язык». Фільм-спектакль.
23.00 «Валерый Прыёмыхаў. Дзве сустрэчы з працягам». Дак. фільм.
0.20 «Сядзі і глядзі». 1994 год.

EUROSPORT

4.00, 8.00, 10.45, 18.45, 22.05 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат ЗША.
9.00 Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат свету. Фіналы.
15.00 Веласпорт. World Ports Classic.
17.00 Веласпорт. Вуэльта.
22.00 Гейм, сэт і Матс.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.00 Камедыя «Крама ліхвяра».
5.45, 13.20, 21.25 Камедыя «Граф».
6.15 Прыгоды «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода».
7.45, 12.40, 13.45, 15.45, 20.40, 21.50, 23.50, 1.45, 3.10 «Камедыянты. Лепшае».
8.00, 16.00, 2.20 Камедыя «Кантралёр універмага».
8.30, 16.30, 2.45 Камедыя «Імігрант».
9.00 Камедыя «Бульварны пераплёт».
11.15 Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
14.10 Камедыя «Машына часу ў джакузі».
17.15 Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
19.20 Камедыя «Невынішчальны шпіён».
22.10 Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».
0.10 Камедыя «Баламут».
3.25 Камедыя «Чалавек-аркестр».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Фільм-казка «Казка пра зорнага хлопчыка». 2-я серыя.
3.05, 9.05, 15.05 М/с «Брэменскія музыканты». Зборнік м/ф «Сланяня турыст». «Дзед Мароз і шэры воўк».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Чорны пірат». Казкі замежных пісьменнікаў. «Арэхавы дубчык». М/ф «Іванка з Палаца піянераў».
5.00, 11.00, 17.00 Прыгоды «Мармуровы дом». М/ф «Ад двух да пяці».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Хрыстафор Калумб».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Дзе абедаў вераблюд?». «Таежная казка». «Яблычны пірог».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.30, 5.15 Серыял «Сябры».
10.55 Маст. фільм «Запаведная дарога».
12.45, 3.55 Маст. фільм «Дні Турбіных».
14.15, 2.20 Серыял «Вар'яты».
16.10 М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
17.30 Маст. фільм «Дзеці шпіёнаў 4: Армагедон».
19.15 Маст. фільм «Забойства дэпутата».
21.20 Маст. фільм «Баарыа».
0.10 Серыял «Жарабец».
0.45 Серыял «Кліч крыві».

ТБ1000

5.00 Драма «Дзяўчына ў парку».
7.00 Драма «Перад захадам».
9.00 Драма «Я спакусіла Эндзі Уорхала».
11.00 Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
12.45 Драма «Забытыя жаданні».
14.40, 0.40 Фэнтэзі «Буйная рыба».
17.00 Камедыя «Дзённікі нянькі».
19.00 Трылер «Слепата».
21.05 Меладрама «Сэрцаед».
23.00 Жахі «Воўк-адзіночка».
3.00 Прыгоды «Беавульф».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 11.00 Гіена.
6.00, 12.00 Па слядах міфічных пачвар.
7.00 80-я: Найвялікшыя футбольныя моманты.
8.00 Славяцы сома.
9.00 З пункту гледжання навукі.
10.00 У пошуках акул.
13.00 Шаша праз пекла.
14.00 Забойствы гарыл.
15.00 Астравы.
16.00 Аўта-SOS.
17.00 Падарожжа да ядра Зямлі.
19.00 Дзікі тунец.
20.00, 0.00 Ліхтугі за мянжой.
21.00, 1.00 Секунды да катастрофы.
22.00, 2.00 Амерыканская калонія.
23.00, 3.00 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY

7.00, 17.20 Як гэта ўстроена?
7.25, 16.25 Каралі сутыкненняў.
8.15 Палёты ўгліб Аляскі.
9.10 Паветраныя дальнабойшчыкі.
10.05, 22.00, 3.30 Паўночная Амерыка.
11.00, 6.05 Піраты выратавання.
11.50, 12.20 Паляўнічыя на рэліквіі.
12.45, 20.05, 2.40 Эд Стафард: выжыванне.
13.40, 14.10 Навука магіі.
14.35, 19.10 Разбуральнікі легенд.
15.30 Хуткія і гучныя.
17.50, 4.45 Як гэта зроблена?
18.15, 0.55 Хлопцы з гарматамі.
21.00 Калі рыба атакуе.
23.00 Лепшы рыбалоў.
0.00 Вулічныя гонкі.
1.50 Смяротная прыхільнасць.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
5.10, 5.40 Каралі аўкцыёнаў.

НЯДЗЕЛЯ, 1 ВЕРАСНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.15 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.35, 0.35 Серыял «Выратаваць боса».
10.45 Урачэбныя тайны.
11.15 Зона Х.
11.45 Нашы.
12.10 Маст. фільм «Той самы Мюнхгаўзен».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Маст. фільм «Хронікі Нарніі: Леў, Вядзьмарка і Чарадзейная шафа».
18.00 «Мая праўда». «Валянцін Смірніцкі. Слёзы Партоса».
19.05 Камедыя «Сям'я».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Журналісцкае расследаванне.
22.30 Баявік «Містар і місіс Сміт».

БЕЛАРУСЬ 2

7.40 М/ф: «Наш сябар Пішычытай», «Чабурашка ідзе ў школу».
8.20 Фільм-казка «Агонь, вада і... медныя трубы».
9.45 Пазакласная гадзіна.
10.00 Тэлебарометр.
10.05 Фільм-фэнтэзі «Рыжык у Залюстраркоўі».
12.30 Камедыя «На спіне ў чорнага ката».
14.20 Меладрама «Нахабніца». Заключныя серыі.
16.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэасамасопіс.
16.55 Хакей. Кубак Салея. Фінал.
19.40 Суперлато.
20.25 Навіны надвор'я.
21.00 «Спортлато 5 з 36».
21.05 «КЕНО».
21.10 Баявік «Бунраку».
23.25 Спорт-кадр.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Прыстанак душы».
8.30 М/ф.
8.55 «Альбарутэнія». Пра развіццё пісьменства.
9.30 «Святло далёкай зоркі». Рыгор Шаршэўскі.
10.00 «Вясна Мікельанджэла». Драма. 1-я і 2-я серыі.
13.00 «Наперад у мінулае».
13.30 «З кошкі ўсё і пачалося». Маст. фільм.
14.45, 22.05 «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі». Дак. фільм.
15.40 «Месца сустрэчы. Школа». Канцэрт.
17.00 «Фантасмагорыі Панін-на». Дак. фільм.
17.15 «Магілёў. Усходняя сталіца Беларусі». Дак. фільм.
17.40 «Браслаўшчына. Край Божай апекі». Дак. фільм.
18.10 «Ад зямлі, ветру і сонца». Навукова-папулярны фільм.
18.40 Сусветнае кіно. «І святло ў цемры свеціць». Маст. фільм.
20.30 Калыханка.
20.50 Канцэрты ў Вялікай студыі Дома радыё. Гітарыст Павел Кухта.
23.05 «Амністыя». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы паводле аднайменнага твора Мікалая Матукоўскага.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.50 «Фазэнда».
11.25 «Наталля Гундарава. Запомніце мяне такой...».
12.40 Маст. фільм «Адзіноким даецца інтэрнат».
14.25 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
16.15 Навіны спорту.
16.20 Драма «Я — Сэм».
18.50 «Я люблю Беларусь!».
20.00 Контуры.
21.05 Камедыя «8 першых спатканняў».
22.55 Закрыты паказ. Маст. фільм «Напісана Сяргеем Даўлатавым».

СТБ

6.05 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
7.50 Маст. фільм «Пяты элемент».
10.00, 16.50 «Аўтапанарама».
10.30 «Тайны свету».
11.30 «Вялікае снеданне».
12.10 «Прывітанне, доктар».
12.45 Маст. фільм «Насімі».
14.40 «Тэрыторыя памылак».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
17.20 «Уявіце сабе».
17.50 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Тайна рукапісу».
23.00 «Якія людзі!».
0.00 Маст. фільм «Я так даўно цябе кахаю».
2.00 «Дакументальны праект»: «Лабараторыя старажытных багоў», «Закладнікі Сусвету», «Тайны змрочнай бездані».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
8.05 «Ведаем рускую».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Аэрасвет».
9.25, 4.15 «Даведнік».
9.55 «Ежа з Зіміным».
10.20 «Нязоркавае дзяцінства».
10.55, 23.40 Маст. фільм «Скарбы старажытнага храма».
13.15 Маст. фільм «Замежны жаніх».
15.10 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
15.45, 21.00 Серыял «Вакзал».
20.00 «Разам».
21.50 Маст. фільм «Мядовы месяц».
2.00 Маст. фільм «Падзея».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Каханне не дзеліцца на 2».
10.10 «Сам сабе рэжысёр».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Смехапанарама».
11.45 «У свеце жывёл».
12.20 «Ха».
12.30 Маст. фільм «Набытак рэспублікі». 2-я серыя.
14.15 «Гарадок». Дайджэст.
14.25 «Галіна Вішнеўская. Раман са славай».
16.20 Маст. фільм «Вучу гульні на гітары». 2-я серыя.
18.10 «Смяяцца дазваляецца».
20.30 «Наш выхад!».
22.15 Маст. фільм «Шчаслівы маршрут».
0.00 Маст. фільм «Позняе каханне».

РТР—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Страхоўшчыкі».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Дачны адказ».
11.25 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Цуд тэхнікі».
12.30 «Першая перадача».
13.15 Маст. фільм «Дзень адчаю».
15.05 «Чыстасардэчнае прызнанне».
15.45 Баявік «Кодэкс гонару-4».
17.25 «З песні слоў не выкінеш».
18.30 Надзвычайнае здарэнне.
19.50 Серыял «Версія-3».
23.25 «Сямён Якубаў. Штурман па жыцці».
0.15 «Луч Света».
0.45 «Школа зласлоўя».

8 КАНАЛ

9.00, 14.15, 19.00, 21.05, 23.25 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 «Сінематограф». Маст. фільм «Вынесеныя ветрам».
14.20 Баявік «Квант міласэрнасці».
16.05 Серыял «Камісар Рэкс».
17.00 Ток-шоу «Бульбокс».
17.30 Серыял «Людзі Альфа».
19.05 Меладрама «Манон Леско».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Трылер «Імга».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 Скетч-шоу «Адны дома».
10.00, 17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Вясельная сукенка».
11.30 «З'ешце гэта неадкладна».
12.00, 20.00, 23.00 Скетч-ш

■ Актуальная тэма

ПАДВОДНЫЯ РЫФЫ ДОЛЕВАГА БУДАЎНІЦТВА

У апошнія гады нам не раз давялося чуць гісторыі аб людзях, якія «апякліся» на долевым будаўніцтве: яны былі вымушаны фінансаваць будаўніцтва сваіх кватэр ледзь не з закладкі фундамента, а ў выніку альбо засталіся ні з чым, альбо марнуюць час на доўгія судовыя разбіральніцтвы. Безумоўна, прасцей за ўсё купляць гатовае памяшканне і не залежаць ад надвор'я на рынку будаўніцтва. Аднак і грошы на такі варыянт ёсць далёка не ва ўсіх.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дом №2 у квартале мінскіх вуліц Гарэцкага—Янкоўскага даўно папоўніў спіс праблемных даўгабудаў. Узводзіць шматпавярховік пачалі напрыканцы 2009 года. Аднак праз паўтара года, якраз падчас фінансавага крызісу, будаўніцтва дома рэзка затармазілася. Зараз жа працэс зноў ажыў. Мінгарвыканкам выдаў прадпісанне фірме-забудоўшчыку — адкрытаму акцыянернаму таварыству «Маналітград» здаць аб'ект да 15 верасня. Аднак жарсці вакол дома бурляць нежартоўныя. І прычына таму — непаразуменне дольшчыкаў і забудоўшчыка вакол унесеных за ўзведзеныя памяшканні грошай.

«Мы свае абавязацельствы выканалі ў поўным аб'ёме»

Дольшчыца Галіна (*імя зменена па просьбе субяседніцы.* — **Аўт**.) паказвае мне таўшчэзную пачку дакументаў. Дагавор аб долевым будаўніцтве офіснага памяшкання, шматлікія лісты ад забудоўшчыка з патрабаваннем даплаціць па новых цэнах, рашэнні гаспадарчых судоў, звароты ў розныя інстанцыі...

— Дванаццаць дольшчыкаў, сярод якіх і я, заключалі дамовы з «Маналітградам» неўзабаве пасля пачатку будаўніцтва ў снежні 2009 года. Мы аплачвалі ўбудаваныя памяшканні на першым паверсе. Узвядзенне сяміпад'езднага дома павінна было доўжыцца самае большае два гады. І менавіта за гэты тэрмін мы павінны былі ўнесці ўсе плацяжы. Усё, што патрабаваў ад нас дагавор, мы выканалі ў поўным аб'ёме. Аднак праца на будоўлі ў 2011 годзе спынілася. Нам патлумачылі прычыну — катастрафічны недахоп грошай.

«Маналітград» мінулай зімой пачаў масава высылаць юрыдычным асобам-дольшчыкам звароты з патрабаваннем даплат. Калі ў 2010 годзе дамовы заключаліся з коштам квадратнага метра ў 3-3,2 мільёна рублёў (у той час — 1060 долараў), то цяпер арганізацыя патрабуе пераліку, што павышае ранейшы кошт у два з паловай разы — да 8,5 мільёна. Па стане на дату пачатку будаўніцтва грошы патрабуюцца велізарныя — 2900 долараў за метр.

Галіна апелюе да ўказа Прэзідэнта № 396. Згодна з ім, забудоўшчык не можа павялічваць кошт квадратнага метра, калі здае ў эксплуатацыю дом пазней за зацверджаныя тэрміны па сваёй віне. Але...

— Новы кошт вызначыла Служба ведамаснага кантролю пры Міністэрстве будаўніцтва і архітэктуры, куды звярнуўся забудоўшчык. Мы столькі плаціць не пагаджаліся — у дагаворы пазначана, што цана квадратнага метра прызнана нязменнай. Тады «Маналітград» сёлета ў лютым звярнуўся ў Гаспадарчы суд Мінска з патрабаваннем прызнаць дагавор міжэрным. Аднак іск быў адхілены, і суд прызначыў правядзенне новай экспертызы кошту за квадратны метр датычна кожнага дольшчыка. Эксперты ацанілі квадратны метр прыкладна на мільён даражэй у параўнанні з сумай у першапачатковым дагаворы. Нават і тая розніца, якая атрымалася, у маштабе цэлага памяшкання азначае тысячы долараў, — зазначае Галіна.

Сапраўдныя прыгоды пачаліся месяц таму, калі з'явіліся вынікі судовай экспертызы. Забудоўшчык не захацеў працягваць гэтую гісторыю далей і вырашыў скасаваць дамовы з дольшчыкамі ў аднабаковым парадку. Лісты з гэтым паведамленнем людзі атрымалі 2 жніўня. Пікантнасці ў сітуацыю дадае той факт, што згодна з адным дагаворам, заключаным яшчэ ў 2009 годзе, чарговае судовае пасяджэнне прызначана на канец жніўня...

«Нам дом дабудоўваць трэба...»

У сваю чаргу, ААТ «Маналітград» раіць шукаць карані гэтай сітуацыі ў трохразавай дэвальвацыі беларускага рубля, якая адбылася два гады таму.

— На наступны год пасля масавага заключэння дагавораў з юрыдычнымі асобамі курс долара рэзка пачаў расці. З-за гэтага падаражэлі ўсе імпартныя будаўнічыя матэрыялы, якія мы былі вымушаны закупляць па больш высокім курсе, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара «Маналітграда» Анатоль Шкурынскі.** — А цэны на айчынныя камплектуючыя таксама скокнулі. За тыя сродкі, якія былі ўнесены раней, дабудаваць дом мы лічым нерэальным.

На заўвагу аб тым, што ў дакументах прапісана цана, якая павінна заставацца нязменнай, намеснік генеральнага дырэктара кампаніі спасылаецца на вынікі той жа праверкі, якая палічыла, што дагавор з тагачасным кіраўніцтвам будаўнічай кампаніі быў заключаны з парушэннямі.

— У гэтым доме ёсць як офісныя, так і жылыя памяшканні. У нас была праверка, якая высветліла, што кошт квадратнага метра заніжаны.

Паводле слоў Анатоля Шкурынскага, праведзеная праверка дала падставы перагледзець і пералічыць усе затраты. Пасля гэтага іх арганізацыя вырашыла падняць цэны як на кватэры, так і на ўбудаваныя памяшканні. Некаторыя дольшчыкі згадзіліся паступова даплачваць згодна з новымі лічбамі. А тыя, хто фінансаваў будаўніцтва офісаў, новыя дагаворы з павышанымі цэнамі падпісваць адмовіліся ўсе. Бо цана ў іх старых дагаворах — прыкладна каля 3 мільёнаў рублёў за квадратны метр. І дакументы гэтыя судом не скасаваны.

— Суды могуць і не адзін год ісці, а працаваць трэба. А тады за якія сродкі дом дабудоўваць? — задае рытарычнае пытанне Анатоль Шкурынскі. — Перад намі кіраўніцтва горада паставіла задачу здаць аб'ект у верасні. Абаротных сродкаў, за якія можна было б дабудаваць памяшканні, у кампаніі не хапае. Таму было прынята рашэнне аб скасаванні ранейшых дагавораў і паступовым вяртанні сродкаў па афіцыйных разліках. Новыя ж дамовы з іншымі юрыдычнымі асобамі заключаны на больш адэкватныя ў сённяшніх рэаліях сумы...

Добра то добра. Але калі згодна з ранейшым дагаворам чалавек плаціў, напрыклад, 3 мільёны, што складала тады тысячу долараў, то сёння за тыя вернутыя 3 мільёны ён і чатырыста долараў не купіць. Няўжо гэта справядліва?

Народная мудрасць гаворыць: «Ведаў бы, дзе ўпадзеш — саломкі падсцяліў бы». Як можна хоць неяк засцерагчы сябе ад доўгіх судовых разбіральніцтваў, на якія непазбежна будуць марнавацца час і грошы?

— Перш чым заключаць дагавор аб долевым будаўніцтве, трэба ўпэўніцца ў тым, што забудоўшчык з'яўляецца надзейным партнёрам, — гаворыць загадчык юрыдычнай кансультацыі № 3 Мінскай абласной калегіі адвакатаў Ірына Хадасевіч. — Тым больш што ў эпоху інтэрнэту складасці ўражанне аб рэпутацыі якойсьці кампаніі значна лягчэй. Неабходна даведацца, колькі гадоў яна існуе на рынку, высветліць, ці вядзе арганізацыя сваю дзейнасць без страт. Адным словам, загадзя сабраць як мага больш звестак аб будучым партнёры. Усю гэтую інфармацыю можна атрымаць ад самога забудоўшчыка альбо з адкрытых інфармацыйных крыніц.

Адносіны, якія ўзнікаюць паміж дольшчыкам і забудоўшчыкам, рэгулююцца Указам Прэзідэнта краіны № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў» ад 15 чэрвеня 2006 года. Ён рэгламентуе шэраг абавязкаў, якія павінны выконваць абодва бакі. Таму мы рэкамендуем дольшчыкам зверыць тэкст дакумента, які яны падпісваюць, з дагаворам, узор якога таксама змешчаны ў гэтым указе.

Перад тым, як ставіць пад дагаворам подпіс, трэба дэтальна азнаёміцца з яго зместам. Асаблівую ўвагу надаць адказнасці бакоў і парадку змянення ўмоў дакумента. Безумоўна, у ідэале лепш прааналізаваць і палажэнні Указа № 396. Але ў ім ёсць шэраг момантаў, якія разам з мяркуемым варыянтам дамовы лепш разбіраць у гутарцы з кваліфікаваным юрыстам. Калі паміж забудоўшчыкам і дольшчыкам успыхне канфлікт, то суд будзе прымаць рашэнне, абапіраючыся, сярод іншага, на гэтыя дакументы.

А калі скончыцца будаўнічы трылер з новабудоўляй у Сухарава, сказаць цяжка. У кожнага боку — што ў дольшчыкаў, што ў будаўнічай арганізацыі — праўда свая. Куды цяжка ўпісваюцца тэмпы росту курсаў валют і інфляцыі рубля. Застаецца спадзявацца, што канчатковую кропку ў гэтай доўгай гісторыі паставіць рашэнне суддзі...

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Газета «Звязда» + www.doktora.by

Звяртаемся да педыятра і артапеда

На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала загадчыца педыятрычнага аддзялення №2 17-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Таццяна ДАРАФЕЕВА.

— Дзіцяці 1 год і 2 месяцы. За апошнія тры тыдні перахварэлі на атыт сярэдняга вуха, ларынгіт (без стэнозу гартані). Пасля ларынгіту ў крыві былі павышаны трамбацыты (480). Ультрагук брушной поласці ў норме, біяхімічны аналіз крыві ў норме, аднак кальцый і ферыцін павышаныя — 2,56 і 53,12. Якая ж норма ферыціну для дзіцяці ў гэтым узросце? У бланку медцэнтра ўказаны дыяпазон 10-300 і ў той жа час ён пазначаны як павышаны. Чым небяспечны павышаны ўзровень кальцыю?

— Узровень кальцыю — 2,56 ммоль/л і ферыціну — 53,12 мг/мл не павышаны. Норма кальцыю — 2,2-2,75 ммоль/л. Норма ферыціну для дзяцей — 30-140 мг/мл. У педыятрыі павышаны ўзровень кальцыю часцей за усё назіраецца пры перадазіроўцы вітаміну D3. Сімптомамі павышэння ўзроўню кальцыю ў крыві з'яўляюцца павышаная смага, млосць, страта апетыту, павышаныя стамляльнасць і раздражнёнасць. Працягла існуючы павышаны ўзровень кальцыю прыводзіць да змен у коснай сістэме, павышаецца ломкасць касцей, з'яўляецца схільнасць да ўтварэння камянёў.

— У 4 гады ў дзіцяці двойчы быў павышаны паказчык аналізу на хларыды поту. Дзіця хварэла штомесяц з кашлем і адкашліваннем. З 2 гадоў нам параілі выдаліць адэноіды, мінданліны. Я недзе вычытала, што адэноіды — гэта прычына лямбліёзу. Лямблій мы выявілі ў крыві і нібыта вывелі. Адэноіды не выдалілі, лячылі харчовымі дабаўкамі, рабілі расціранні крэмам «тайфу». У 4 і 6 гадоў дзіця лячылі ў санаторыі — інгаляцыі, салявыя шахты... У 10 гадоў дзіця хварэла досыць працягла, паставілі бранхіт. Пры гэтым урач накіраваў на даабследаванне ў пульманалагічнае аддзяленне. Паўторныя аналізы на хларыды поту зноў далі павышаны паказчык

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Ваша дзіця павінна назірацца ва ўрача-гематолага па месцы жыхарства.

у параўнанні з нормай. Урачы параілі здаць кроў абодвум бацькам і дзіцяці для ДНК-тэста. Муж адмаўляецца, гаворачы што дастаткова паўторных аналізаў на хларыды поту. Я чула, што трэба зрабіць здымак насаглоткі. Здымак страўніка нам рабілі: праблем тут няма.

— Павышаная колькасць хларыдаў у потавай спробе вашага дзіцяці ўказвае на магчымую наяўнасць такога спадчыннага захворвання, як мукавісцыдоз. Мукавісцыдоз абумоўлены наяўнасцю паталагічнага гена, атрыманага ад бацькоў, праяўляецца зменамі з боку органаў дыхання і страваванння. Для вызначэння паталагічнага гена вам рэкамендавана прайсці ДНК-тэст. У далейшым жа вам спатрэбіцца кансультацыя генетыка.

— Ганна. Майму сыну 1 год і 7 месяцаў. З нараджэння ў яго нізкі гемаглабін. Здалі агульны аналіз крыві. Урач лабараторнай дыягностыкі ўказаў на нейтрапенію і лімфацытоз. Вось паказчыкі: эрытрацыты 4,81; гемаглабін 130; гематакрыт 38; сярэдні аб'ём эрытрацыта 79; сярэдняе ўтрыманне гемаглабіну ў эрытрацыце 27; сярэдняя канцэнтрацыя гемаглабіну ў эрытрацыце 342; трамбацыты 234; лейкацыты 7,9; базафілы % 1; эазінафілы % 3; нейтрафілы: палачкаядзерныя % 1; сегментаядзерныя % 9; лімфацыты % 82; монацыты % 4. Хуткасць асядання эрытрацытаў — 4. Што гэта азначае? Што нам рабіць? Тэмпературы няма, здалі аналіз на дысбактэрыёз...

— З улікам змяненняў у агульным аналізе крыві, неабходна паўтарыць аналіз праз 2-3 тыдні. Пры захаванні змяненняў вашаму дзіцяці спатрэбіцца кансультацыя ўрача-гематолага. Накіруе да яго ваш педыятр.

— У дзіцяці набытая з-за пералівання крыві аўтаімунная гемалітычная хвароба. Дзіцяці 10 месяцаў. Зараз — стадыя рэмісіі. Патрэбны добры ўрач-педыятр. Парайце, да каго звярнуцца.

На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала загадчыца артапедычнага аддзялення 17-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Веранікa НАВОЕВА.

— Дзіцяці 3 месяцы. Расшыфруйце, калі ласка, вынік ультрагукавога даследавання тазасцегнавых суставаў. Правы: пазіцыя галоўкі цэнтравана, ядро акасцянення не вызначаецца; вонкавы косны выступ выражаны добра, лімбус вузкі, размешчаны тыпова, вугал а: 62, вугал б: 59; тып сустава па R Graf: развіты сустаў 1А. Левы: пазіцыя галоўкі цэнтравана; ядро акасцянення не вызначаецца; скошанасць покрыўкі вяртлужнай упадзіны; вонкавы косны выступ згладжаны; лімбус вузкі, размешчаны тыпова; вугал а: 56, вугал б: 70; тып сустава па R Graf: дысплазія IIБ. Наколькі гэта сур'ёзна? Якія можна даць рэкамендацыі? Урач, акрамя падушкі Фрэйка, нічога больш не прапісаў.

— Урач выставіў правільны, своечасовы дыягназ. На гэтым этапе лячэння асноўным з'яўляецца правільнае становішча ног, неабходнае для стварэння аптымальных суадносін і развіцця элементаў тазасцегнавога сустава. Для дасягнення неабходнага становішча (адвядзення і згібання ў тазасцегнавым суставе) выкарыстоўваюцца розныя віды шын. Пры гэтым тыпе дысплазіі аптымальным з'яўляецца шына Фрэйка. Таксама да лячэння можна дадаць пасіўны лячэбна-фізкультурны комплекс на згібанне і адвядзенне ў тазасцегнавым суставе падчас замены памперса.

— Дзіця было на кантрольным ультрагуку пасля 2,5 месяца нашэння падушкі Фрэйка. Вынік: галоўка цэнтравана; ядраў няма; покрыўка сфарміравана і не зменена, косны выступ акругленай формы, вугал справа а — 68, б — 52; злева: а — 65, б — 54. Заключэнне: тып 1б. Пахрустваe левы сустаў пры выкананні «лягушкі». Што гэта азначае?

— Па выніках кантрольнага ўльтрагуку можна меркаваць аб дасягненні добрага выніку лячэння. «Шчаўкі», «пахрустванні» пры выкананні лячэбнай фізкультуры ў тазасцегнавым суставе дапушчальныя.

— Дзіцяці 3 месяцы. На рэнтгене выявілі дысплазію тазасцегнавога сустава. Заключэнне пасля рэнтгену: лінія Шэнтана неперарыўная з абодвух бакоў, ядры галовак сцегнавых касцей не сфарміраваны, справа: а=31°, h=8 мм; злева а=26°, h=9 мм. Прызначылі шыну Кошлі на тры месяцы (23 гадзіны ў суткі) і лячэбную фізкультуру (круцільныя ножкі 100 і больш разоў у дзень). Да шыны прывыкаем цяжка. Ці можна насіць менш часу (ноччу і нейкі час днём)? Або прымяніць іншыя працэдуры (падушка, масаж)?

— Улічваючы даныя рэнтгенаграмы, узрост дзіцяці, доктар выставіў правільны, своечасовы дыягназ. На гэтым этапе лячэння асноўным з'яўляецца правільнае становішча ног, неабходнае для стварэння аптымальных суадносін і развіцця элементаў тазасцегнавога сустава. Для дасягнення неабходнага становішча (адвядзення і згібання ў тазасцегнавым суставе) выкарыстоўваюцца розныя віды шын. Прывычваць дзіця да шыны неабходна паступова. Першыя 3-5 дзён — толькі ў дзённы час. Таксама варта працягваць пасіўную лячэбную фізкультуру на згібанне і адвядзенне ў тазасцегнавым суставе падчас змены памперса. Кантрольны агляд праводзіцца, як правіла, праз 1,5 месяца нашэння шыны.

Святлана БАРЫСЕНКА

НЕ СТАЛОВАЯ, А КОМПЛЕКС

Днямі ва ўрачыстых абставінах адкрылі новы гандлёва-прамысловы комплекс прадпрыемства «Гефест-тэхніка» па вуліцы Суворава ў Брэсце. Названае прадпрыемства з'яўляецца структурным падраздзяленнем сумеснага прадпрыемства адкрытага акцыянернага таварыства «Брэстгазаапарат».

Раней тут размяшчалася сталовая, дзе харчаваліся работнікі суседніх прадпрыемстваў. Потым, у 1990-я гады, калі вытворчасць згасала, сталоўка таксама прыйшла ў заняпад, разышліся работнікі. А некалькі гадоў таму будынак набыў «Газаапарат». У рэканструкцыю і пашырэнне былі ўкладзены немалыя сродкі. І цяпер тут з'явілася сталовая на 300 месцаў з магазінам «Кулінарыя». Харчавацца ў новым комплексе выказалі намер працаўнікі не толькі «Гефест-тэхнікі», але і суседняга завода «Брэстмаш», вялікай швейнай фірмы, якая размешчана непадалёку. Усяго на гэтых прадпрыемствах занята каля трох тысяч чалавек, якія раней не мелі магчымасці атрымліваць паўнацэннае гарачае харчаванне. Акрамя таго, утульнае прасторнае памяшканне з сучасным дызайнам, напэўна, будзе запатрабавана як месца правядзення вяселляў ды іншых урачыстасцяў.

Яна СВЕТАВА.

УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

СПЕЦИАЛИСТЫ (С ОПЫТОМ РАБОТЫ):
- **МАСТЕР** УП ЖЭС 1 (ул. Интернациональная, 4) УП ЖЭС 13 (ул. Нововиленская, 6) УП ЖЭС 34 (пр. Независимости, 27а) УП ЖЭС 38 (ул. Сторожевская, 8)
- **ИНЖЕНЕР-ЭНЕРГЕТИК**
- **ИНЖЕНЕР** в технический отдел на период декретного отпуска
- **ИНЖЕНЕР ПО ГРАЖДАНСКОЙ ОБОРОНЕ**
- **ИНЖЕНЕР ПО ОБРАЩЕНИЮ С ОТХОДАМИ** в отдел благоустройства на период декретного отпуска
- **ПАСПОРТИСТ** (ул. М. Танка, 36/1)

Возможен карьерный рост!

РАБОЧИЕ:
- **ТРАКТОРИСТ**
- **НАЛАДЧИК КИП и А**
- **СЛЕСАРЬ-САНТЕХНИК УП ЖЭС**
- **КРОВЕЛЬЩИК по металлическим кровлям УП ЖЭС**
- **МАЛЯР УП ЖЭС** (Требования 3-4 разряд)
- **ЭЛЕКТРОМОНТЕР УП ЖЭС** (Требования 3-4 разряд)
- **ОПЕРАТОР ПЭВМ** (6-р Шевченко, 20)
- **СЛЕСАРЬ-ЭЛЕКТРИК по ремонту электрооборудования** (ул. Нововиленская, 10а)
- **ГРУЗЧИК** (ул. Новаторская, 53а)
- **РАБОЧИЕ по комплексной уборке УП ЖЭС**

Возможно обучение и повышение квалификации по указанным профессиям на производстве

СВОЕВРЕМЕННАЯ з/плата! ПОЛНЫЙ СОЦ. ПАКЕТ (оказание мат. помощи к отпуску, выделение путевок на оздоровление, постановка на квартирный учет нуждающихся)!

Дружный и доброжелательный коллектив! Будем рады всем!

Обращаться по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, 20а**

Тел.: 327 67 52

УНП 100055817

■ Свята ў доме

УЛАДАР СЯЛА

павінен мець жонку, дзяцей і быць добрым гаспадаром

Абласны тур рэспубліканскага праекта «Уладар сяла», які праходзіў у пасёлку Жамчужны Баранавіцкага раёна, нагадваў сапраўднае свята: было шмат гасцей, музыкі і весялосці. Праўда, самім канкурсантам усё ж прыходзілася напружвацца, выконваючы шмат у чым неўласцівую ім працу. Лепш за ўсіх з неардынарнымі заданнямі справіліся муж і жонка Абрамовічы (Дзмітрый, Наталля) і трое іх дзяцей. Менавіта гэтая сям'я і прадставіць Брэстчыну на рэспубліканскім конкурсе.

Фрагменты конкурсу «Уладар сяла».

Свята прыцягнула многіх: панаехалі паны на брычках, завіталі цыганы і грацыёзныя амазонкі на скакунах. Дарэчы, апошнія падчас перапынку прадэманстравалі выдатнае ўменне знаходзіць агульную мову паміж чалавекам і канём. Гледачы прыйшлі ў поўнае захапленне, а канкурсанты ў гэты час рыхтаваліся да сапраўднага выпрабавання. Адно з заданняў — «святочны воз», паводле якога трэба было пасадзіць жонку на брычку і з годнасцю пракаціць, ды так хутка і ўмела, каб не збіць пастаўленыя на дарозе фішкі і не закрануць нікога з гледачоў, якія шчыльна абступілі месца конкурсу. Шчыра кажучы, не верылася, што ўсе справяцца: адкуль такія навыкі ў сучасных мужчын, няхай яны і жывуць на вёсцы? Але, насуперак чаканням, «галовы» сямействаў не падвялі.

А як ляцелі трэскі, калі секлі дровы! Не думаю, што канкурсанты ўпершыню трымалі ў руках сякеру, усё ж на вёсцы дровы даводзіцца нарыхтоўваць — калі не сабе, дык цешчы. Сасновыя паленцы разляталіся на раз, і тут жа да справы прыступалі жонкі, якім трэба было з дроў складасці слова «лён». Да гонару мужчын, заўважу, што дровы яны пасеклі хутчэй, чым перабралі крупы. Падчас конкурсу «Папялушка» ў гэтую казачную гераіню ператварылі менавіта мужчын. Ім прыйшлося хутка і спрытна аддзяляць грэчку ад гароху. Рукі слухаліся дрэнна, дзеці, якія імкнуліся дапамагчы, асабліва маленькія, больш перашкаджалі, але сапраўдныя ўладары вёскі не маглі дазволіць сабе ні раздражнення, ні заўваг. Жонкі ў гэты час чаравалі над шэдэўрамі з мукі. І калі адны прыгатавалі банальныя варэнікі, то іншыя здолелі зрабіць нешта накшталт... зямнога шара або выявы чалавека.

Але ўсё гэта было пазней, а спачатку трэба было пазнаёміцца. Візітоўка так і называлася: «Вітаем па-беларуску» і з'яўлялася хатнім заданнем. Але многія (ці то з беларускай мовай не сябруюць, ці то па звычцы) сталі прадстаўляць сваю сям'ю на рускай. Журы звярнула ўвагу на гэты факт і зняло балы. Скажам, сям'я Мікалая і Вольгі Шабаноў з СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёна ўразіла сваім вакальным талентам. Малодшы сыночак сям'і Паўлюкевічаў з Лунінецкага раёна яшчэ не ўсе літары вымаўляе правільна, але пра сэнс сямейнага шчасця гледачам распавёў і сарваў апладысменты. І ўсё ж больш прыемна было слухаць тыя сем'і, якія гаварылі на роднай мове. Гэта былі муж і жонка Дабравольскія з Ляхавіцкага раёна, Пашкевічы з Пружанскага, Павел і Вольга Кот з вёсачкі з прыгожай назвай Рэчкі Івацэвіцкага раёна. А муж і жонка Кавальскія са Столінскага раёна агучылі сваю мару абзавесціся аграсядзібай і праводзіць там вясельны абрад згодна з беларускімі народнымі традыцыямі.

Трэба сказаць, што журы конкурсу, якое ўзначальваў намеснік старшыні Баранавіцкага райвыканкама Сяргей Сліва, прыйшлося няпроста, хоць па выніках заданняў лідары вызначыліся хутка. Сярод 8 пар лепшымі сталі сем'і Абрамовічаў з Баранавіцкага раёна і Ганчароў з Пружанскага. Тройку лідараў замкнулі Пашкевічы з Жабінкаўскага раёна.

Паліна ГАЛІЕЎСКАЯ Фота аўтара

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.10.2013 г. будуць разыграны 7 бесшнуравых тэлефонных апаратаў і суперпрыз — тэлевізар LG. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20.10.2013 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 31.12.2013 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

Правілы рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў газеце «Звязда» за 16.08.13 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 20.08.13 па 31.12.13.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2211 ад 25.07.13, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на IV кв. або 2-е паўг. 2013 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

КАБ ШКОЛЫ НЕ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ НАСТАЎНІКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тады і праблема адтоку адораных дзяцей у іншыя навучальныя ўстановы ўзнікаць не будзе.

— Мы неаднаразова ўзнімалі праблему захавання падрыхтаванай інтэлектуальнай эліты, — дадаў Міхаіл Мірончык. — Нават сёлетнія пераможцы міжнародных алімпіяд сталі студэнтамі не толькі нашых ВНУ, а паступілі ў ВНУ краін як блізкага, так і далёкага замежжа. Лічу, каб сітуацыю змяніць, трэба не толькі даваць вучням бліскучыя веды, але і выхоўваць у навучэнцаў грамадзянскую адказнасць перад настаўнікам, школай, горадам і краінай за рэалізацыю свайго інтэлектуальнага патэнцыялу.

Для выхавання будучай эліты патрэбны кадры вельмі высокай кваліфікацыі. Яны ёсць сярод нашых настаўнікаў і ўніверсітэцкіх выкладчыкаў. Іх імёны шырока вядомыя: Лаўрыновіч Леанід Іванавіч, Камракоў Барыс Барысавіч, Мазанік Сяргей Аляксандравіч, Хвалюк Віктар Мікалаевіч і іншыя. Але хто прыйдзе ім не змену? Вельмі трапна сказаў не так даўно кіраўнік нашай дзяржавы пра тое, што калі таленавіты хірург не падрыхтаваў сабе падобных, значыць, сваю прафесійную місію ён выканаў не да канца. Мяркую, што ў поўнай ступені гэта тычыцца і настаўніцтва. Тым больш што пытанне пра стварэнне школ «зорных» настаўнікаў ставілася неаднаразова. Лічу, што ўсім нам работу ў гэтым кірунку трэба ўжо не проста актывізаваць, а фарсіраваць. Варта таксама прызнаць, што мы далёка не ў поўнай ступені выкарыстоўваем магчымасці Мінска для прыцягнення знешніх інтэлектуальных рэсурсаў для вырашэння задач па павышэнні якасці адукацыі...

Фізіка ці філалогія? Выбірай...

Найбольш сур'ёзныя змяненні ў арганізацыі і змесце адукацыйнага працэсу ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі адбудуцца ў новым навучальным годзе на трэцяй ступені ў сувязі з увядзеннем вывучэння асобных прадметаў на павышаным узроўні. Прыкладна восем гадоў таму ў сталіцы дыферэнцыраваным навучаннем на старшай ступені школы былі ахоплены 82% навучэнцаў. На павышаным і паглыбленым узроўнях прадметы вывучаліся больш чым у 90% устаноў. Класы фізіка-матэматычнай накіраванасці былі ў 70 установах адукацыі, а хімік а-біялагічныя класы — у 23.

З 1 верасня ў Мінску па новых вучэбных планах будуць працаваць 94 дзясятыя класы, або трэцяя частка ад іх агульнай колькасці, у тым ліку 37 фізіка-матэматычных класаў, 5 класаў хімік а-біялагічнай накіраванасці, 39 — філалагічнай і 8 — грамадазнаўчай. А ў 169 дзясятых класах усе прадметы будуць вывучацца на базавым узроўні. Аднак так званыя «профільныя» класы размеркаваліся па горадзе нераўнамерна (ёсць раёны, дзе адсутнічаюць, скажам, фізіка-матэматычныя класы або класы грамадазнаўчай накіраванасці), паколькі для адкрыцця такіх класаў патрабавалася наяўнасць развітой адукацыйнай інфраструктуры, педагагічных кадраў і зацікаўленасць з боку вучняў і іх бацькоў.

— Каб атрымаць станоўчы адукацыйны эфект, неабходна вывучаць запыты старшакласнікаў і іх бацькоў і распрацаваць парадак і крытэрыі прыёму ў класы з павышаным узроўнем навучання прадметаў, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Міхаіл Мірончык. — А што тычыцца павышэння якасці і эфектыўнасці факультатыўных заняткаў у школах, то тут, мяркую, перш за ўсё, трэба змяніць псіхалогію і настаўнікаў, і кіраўнікоў установы адукацыі: факультатывы павінны быць не сродкам для павелічэння заработнай платы педагогам, а магчымасцю для навучэнцаў рэалізаваць іх права на развіццё інтарэсаў і здольнасцяў.

Чаму не затрымліваюцца маладыя педагогі?

Адукацыйны працэс у сталічных установах адукацыі ажыццяўляюць сёння 30,7 тысячы педагагічных работнікаў. 89,3% педагогаў, якія працуюць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, маюць вышэйшую педагагічную адукацыю. **Разам з тым, у горадзе канстатуюць высокую змяняльнасць маладых настаўнікаў — 45% штогод!** Хвалюе кіраўніцтва сталічнай сістэмы адукацыі і адсутнасць ахвотных паступаць на педагагічныя спецыяльнасці.

— Заўтра можа скласціся сітуацыя, калі ў школу не прыйдуць дыпламаваныя настаўнікі матэматыкі, фізікі, пачатковых класаў і іншыя. Праблема — у нізкім сацыяльным статусе настаўніка. Таму горад выходзіць з ініцыятывай адрадзіць у сталіцы педагагічны каледж, дзе будуць рыхтаваць настаўнікаў пачатковай школы і выхавальнікаў для дашкольных устаноў, — паведаміў Міхаіл Мірончык.

Між іншым, у дашкольных установах горада вышэйшую спецыяльную педагагічную адукацыю маюць толькі 30,3% педагогаў...

Яшчэ адна праблема — змяняльнасць кіраўніцкіх кадраў. У апошнія гады яна ўзрасла па ўсіх катэгорыях кіраўнікоў.

— Безумоўна, ратацыя непазбежная, а прыход моладзі ў сферу кіравання — працэс натуральны і неабходны, — лічыць кіраўнік сістэмы адукацыі. — Маладыя кіраўнікі — мабільныя, па-добраму амбіцыёзныя, адчувальныя да ўсяго новага. Аднак часта гэтыя якасці нават не паспяваюць атрымаць свайго развіцця. Найбольш трывожная сітуацыя складваецца з намеснікамі дырэктараў па выхаваўчай рабоце, дзе летась змяніўся кожны чацвёрты з іх. Як наступства — такі ж высокі паказчык змяняльнасці спецыялістаў, якія знаходзяцца ў непасрэдным іх падпарадкаванні. Пагадзіцеся, што ў такой сітуацыі наўрад ці можна сур'ёзна паўплываць на якасць і вынікі выхаваўчага працэсу.

Міхаіл Мірончык паведаміў, што з гэтага навучальнага года ў Мінску стартуе праект «Электронная школа», які дазволіць аптымізаваць унутрышкольны дакументаабарот. Педагогі змогуць у рэжыме анлайн прасочваць індывідуальную траекторыю навучання школьнікаў, а бацькі атрымаюць рэальную карціну вучэбных дасягненняў свайго дзіцяці. Новы ІТ-праект патрабуе ад кіраўнікоў высокага ўзроўню валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі, але актыўнай зацікаўленасці з боку кіраўніцкіх кадраў авалодваць імі не назіраецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «Многоэтажный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения и многоуровневой гараж-стоянкой № 3 по генплану по пр. Дзержинского в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожной – пер. Разинского – пер. 1-го Извозного» (1-я очередь, без строительства ТП № 40.6 по генплану),

опубликованную в газете «Звязда» 17.12.2011 года, газете «Рэспубліка» 25 ноября 2011 года»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09.***

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-, 2-, 3-комнатные квартиры.

Стоимость 1 кв.м 1-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 650 (одна тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 2-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США.

Стоимость 1 кв.м 3-комнатных квартир при оплате в рассрочку 1 500 (одна тысяча пятьсот) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США.

По соглашению сторон оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка.

УНП 100070331

06.09.2013 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О списании дебиторской задолженности.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 30.08.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400022625

Сяргей РУБЛЕЎСКІ

РАЙ НА ЗЯМЛІ

ЛЮДЗІ аніяк не могуць даць сабе веры, што Бог, раззлаваны на свавольных Адама і Еву, беззваротна выгнаў абаіх і ўсіх нашчадкаў — гэта значыць, нас з вамі — з раю. Асабліва — жанчыны: у іх карацейшая памяць на грэх. Да таго ж гэтае нявер'е зноў і зноў падсілкоўваецца характвом ды асалодай, якія кладуцца на душу залатымі зараніцамі не надта асэнсаванага, але такога жывога і пераканаўчага вобраза раю.

Закаханаму юнаку, уджаленаму пацалункам красуні, здаецца, што мінулага няма, а ёсць толькі будучыня — бязмежная, як вечнасць.

Выведзены подручкі на сонечны прыгрэў зусім нямоглы дзядок згадвае на прызбе мінулае і, ачмурэлы ад свежага водарнага паветра і спеву птушак, раптам адчувае, што не баіцца смерці... Хіба можа такое харство назаўсёды заплюшчыць сваю зыркасць сённяшняй, як і ўчора маючай быць балючай, ночкай?!

Мурзаты хлапчук, які ў цесным коле сябрукоў пруточкам выкочвае з гарача прысака свежаспечаную бульбіну, а тады похапкам, перакідваючы яе з далоні на далонь, трохі астуджвае, абірае і, апякаючы язык і паднябенне, бо не церпіцца, таропка есць, каб не прапусціць смак маленства...

Апантаны рыбалоў на гумавай лодцы, нібы на ўдала прынесенай ветрам лісцінцы, з натхнёным сэрцам аддаецца рачной плыні і, зачараваны чысцінёй і харастом свету, узрушаны таямніцай блізкай прысутнасці шчупакоў, раптам заўважае, што час для яго, у адрозненне ад ракі, не цячэ, а сашчыльніваецца ў адно імгненне. Дзень-імгненне роўны вечнасці, якая хутка праходзіць...

Дзяўчыне, якая забылася на сябе ў любошчах, здаецца, што яе няма, як учарашняй веснавой пупышкі — раскрылася, і толькі гарачыя, пяшчотныя вусны каханага даюць шчаслівыя знакі вяртання з забыцця...

Колькі іх, такіх нязгасных у памяці водбліскаў раю, якія абачлівыя людзі называюць «шчаслівымі імгненнямі»!

Уяўленне пра ніколі не бачаны, але, здаецца, такі магчымы рай заўсёды звязана з часам, пераканаўчай прыкметай Божай прысутнасці ў нашым жыцці.

Гэтая акалічнасць была ўдала скарыстана архітэктарамі камунізму, запраектаванага як шырока адкрыты для ўсіх рай на зямлі. А больш дакладна, маючы быць шырока адкрыты ў «светлай будучыні».

Рай — заўсёды абяцанне. Сучаснасць толькі напаўняе душу неўміручай надзеяй.

Прайшло столькі гадоў, а я не магу дараваць запальчываму і няўседліваму, «тропку бліну», як у нас кажуць, Мікіту Хрушчову за тое, што ён здратаваў, спаліў і попелам развеяў светлую, як абяцаная будучыня, надзею мільёнаў і мільёнаў людзей. У тым ліку і маю. Гэта ж трэба, у першай палове 1960-х гадоў заявіць, што камунізм у СССР будзе пабудаваны к 2000 году. На той час вучань малодшых класаў, я і па сёння добра памятаю падручнік, фарсацы якога спрэс былі задрукаваны карцінкамі будучага бестурботнага жыцця з адпаведнымі подпісамі да іх. Шматпавярховыя гмахі — кожнаму будзе па бязвыплатнай кватэры, карпусы курортаў — кожны ўлетку будзе млець у салодкай стоме на цёплым марскім пясочку... Ну і гэтак далей.

А дзе тое? Пытанне зусім не рытарычнае пасля стольких чалавечых ахвяр, пакладзеных на алтар камунізму. Даўно мінуў 2000 год, а цудадзейныя перамены не толькі не адбыліся, але, наадварот, будаўнічая пляцоўка «светлай будучыні» ўшчэнт разрабавана, вокны і дзверы з незавершаных муроў павыдзіраны з коранем ды разнесены па сядзібах...

А трэба было не хваліцца загадзя, не абвяшчаць тэрмін спраўджвання мары і надзеі!

Праўда, Мікіта — буду справядлівым — у свой час вельмі ўсцешыў мяне з сябрукамі. Апантаны кукурузалюб, «каралеву палёў» ён патрабаваў садзіць у калгасах квадратна-гнездавым спосабам, а не высяваць сеялкай, як цяпер. Тоўстыя пругкія сцёблы, з якога боку ні глянь, стаялі роўненькімі радочкамі, густое лісце давала прахалодную засень, сакаўныя кіяхі спакуслівa тырчэлі на сцёблах у розныя бакі: адламай, аблушчы і пакаштуй малочныя салодкія зярняты... Мяцёлкі кукурузы былі куды вышэй ад нашых стрыжаных галоў, але я і дагэтуль не ведаю, вялікі быў тады ўраджай ці так сабе. Таму што сам быў маленькі...

О, як мы, жэўжыкі, бегалі па тых кукурузных радах, аж трэтар ішоў! Як гулялі ў хованкі — не знайсці, ды і самому лёгка было згубіцца ў паглынальнай зеляніне так, што даводзілася перасякаць усё поле, каб выбіцца на які ўскраек...

Кукурузнае каралеўства ад Мікіты Хрушчова было для нас, акцябрат і піянераў, дзівоснай райскай купінай. Але што ж гэта за рай, з якога нават не Бог, а час выганяе адразу, як толькі заканчваецца дзяцінства...

Апроч самага распаўсюджанага абяцання раю на тым і на гэтым свеце, калі вызначальным фактарам з'яўляецца якраз час (трэба толькі дачакацца!), ёсць і прасторавы спосаб, прытым не абяцанне, а рэальнага пошуку і заснавання раю на зямлі. Тэрмін для гэтага патрабуецца непараўнальна меншы. У некаторых выпадках гэты спосаб больш дакладна назваць геаграфічным.

Нават манахі, Божыя служкі, якія даводзяць да ладу свой прытулак, прымерваюцца не інакш як да намаляванага ўяўленнем, з падказкі Біблії, вядома, райскага куточка.



Мікалаюс-Канстанцінас Чурлёніс. «Рай».

Ды і ў звычайных людзей тое самае. Шмат хто імкнецца атрымаць добры надзел на беразе ракі ці возера і каб яшчэ лес ці якія зараснікі нерушныя падступалі да самай мяжы, збудаваць церамок, а на двары, замкнёным ад суседзяў высокай агароджай, пасадзіць сартавыя, каб на ўсю шапку, ружы, дзівосныя, прывезеныя з-за мора дрэвы і хмызы, а яшчэ паставіць агромністы вальер з высакародными прыгажунамі аленямі, а на волю выпусціць злых, мардатых, са зверскім выскалам, але ласкавых да сваіх сабак... Некаторыя людцы агароджу ўзводзяць такую шчыльную і высокую, што, здаецца, і сам Бог не пералезе. І тут дарэчы згадаць выказванне аднаго знаўцы іўдзейскага містычнага вучэння Кабалы: гэта не Бог, сцвярджае ён, выгнаў Адама і Еву з раю, а, наадварот, Адам адтуль выгнаў Яго...

Што да гэаграфічных пошукаў раю, дык самай запамінальнай такой спробай з'яўляецца марская экспедыцыя Хрыстафора Калумба ў 1492—1493 гг. Хачу звярнуцца не да гістарычных хронік, а да славутага рамана аргенцінскага пісьменніка Абеля Пасэ «Райскія сабакі». Паводле гэтага цікавага твора, Хрыстафор адправіўся ў сваё далёкае падарожжа з бласлаўлення абазнаных у старажытным таямнічым вучэнні адзінаверцаў. Яўрэі тады цярпелі вялікі націск ад іспанскіх улад: іх пад прымусам абавязвалі прымаць хрысціянства, пагражалі выгнаннем з краіны, што і адбылося акурат у 1492 годзе, калі караблі Калумба былі ў далёкай экспедыцыі. Дык, натуральна, што ён, патаемны іўдзей, яшчэ не ведаў пра трагедыю сваіх адзінаверцаў і зацята, з зайздроснай рашучасцю і мужнасцю вёў караблі, каб выканаць у тым ліку і іх наказ. У прадчуванні бяды духоўныя старэйшыны яўрэяў загадалі яму адшукаць прыдатны зямны куток для свайго народа, каб у выпадку рэпрэсій у Іспаніі знайсці прытулак хоць на краі свету. Зазначу, што спрактыкаваны ў марской справе Хрыстафор плыў не наўгад, куды вочы глядзяць, а вызначыў курс з улікам свайго стараннага даследавання накіду карты фларэнтыйскага географа і касмагона Паола Тасканэлі. Накід дзякуючы выпадку патрапіў яму ў рукі.

Калі 12 кастрычніка 1492 года Калумб нарэшце ступіў на вастраў Сан-Сальвадор Багамскага архіпелага, дык ачмурэлы ад радасці, адразу прызнаў: вось ён, той шуканы нерушны прытульны куток, сапраўдны рай на зямлі!

Высока ў небе шчодрылася зыркае сонца, з галіны на галіну павольна пераляталі нібы адмыслова размаляваныя ўспрытнёнымі мастакамі да свята птушкі, на дрэвах віселі невядомыя дагэтуль сакаўныя плады... «Бог напуціў мяне. Бог ведае, якога куточка на зямлі варты мой гнаны народ...» — падумаў Калумб.

Чым далей ад берага ён з камандай заходзіў у глыб вострава, тым больш і больш поўніўся перакананнем: ну так і ёсць, гэта рай на зямлі. Нарэшце знойдзены!

Традыцыйна амаль што цалкам аголеных зычлівых, гасцінных тубыльцаў Яны знявечылі і згубілі квецень іншых народаў... Марадзёры днём, злачынцы па начах, забойцы свету».

Вядомы амерыканскі гісторык Дэвід Станард у кнізе «Амерыканскі Халакост» піша, што самыя ўдалыя, калі іх можна так назваць, з народаў Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі сёння захавалі не больш за 5 працэнтаў ад сваёй ранейшай колькасці.

Іспанскія каланісты вешалі, засмажвалі на ражнах, спальвалі індзейцаў на кастрах, секлі людзей на кавалкі і кармілі сваіх сабак. Ці проста секлі без дай прычыны... Хаця не, так яны правяралі вастрыню толькі што наточаных на прыбярэжных камянях мячоў. Дэвід Станард падлічыў, што сярэдняя працягласць жыцця збіральнікаў кокі, індзейскіх рудакопаў доўжылася не больш за тры ці чатыры месяцы. Прыкладна такі ж тэрмін жыцця быў і ў паднявольных рабочых фабрыкі сінтэтычнай гумы ў Асвенцыме ў 1943 годзе.

Вынішчэнне еўрапейцамі карэннага насельніцтва двух амерыканскіх кантынентаў, на думку даследчыкаў, з'явілася самым масавым і доўгім генацыдам у сусветнай гісторыі. Так што Гітлеру было ў каго павучыцца.

Але аблуднае памкненне ўзяцца за Божую справу і пабудаваць ці знайсці гатовы рай на зямлі або нешта падобнае да яго застаецца з чалавекам. І геаграфічны падыход да ажыццяўлення мары-мэты цяпер, у эру немагчымага пры Калумбе развіцця камунікацый, па-ранейшаму з'яўляецца вельмі спакуслівым. Многія ж людзі з усіх куткоў свету і па сёння лічаць Амерыку гістарычна аформленым райскім надзелам. Іх зусім не засмучае той факт, што «цемнаскурыя анёлы» ратуюцца ў рэзервацыях. Хоць, можа, гэтае міжвольнае і своеасаблівае адцуранне ад вычварэнскага свету індзейцы і сапраўды лічаць своеасаблівым райскім затулкам. Прынамсі, у параўнанні з лёсам сваіх далёкіх продкаў.

Ну а што мае родныя беларусы, людзі, якія не маюць свайго марскога ўзбярэжжа і, адпаведна, расцуглянай геапалітычнай ініцыятывы? Якое ў іх прымерванне да ўзорнага жыцця першалюдзей, якіх Бог надзяліў было сваім бласлаўёным затулкам?

Звужу адказ на гэтае пытанне сардэчна цёплымі межамі роднасці і скажу толькі пра пакаленне маёй мамы, людзей, якія перажылі Вялікую Айчынную вайну.

Мама, патомная сялянка, старанная калгасніца, ніколі не думала пра райскае жыццё. Нават не сніла яго. Яна толькі заўсёды баялася, каб зноў не вярнулася пекла, і, як многія беларускі ейнага веку, пры ўсіх жыццёвых нягодах і выпрабаваннях толькі і ведае, што як малітоўны рэфрэн паўтарае: «Абы не было вайны...» Маўляў, і нішчымніцу перажывём, і голад, і холад, толькі б не загрымела смяротным громам неба, не ператварылася родная зямелька ў пякельную патэльню, толькі б не ахвяраваць сваімі сынкамі дзеля яе ратавання... Некаторыя глабальныя людзі з пакалення next наракаюць на бабулек: «От жа, вам усё адно, як мы жывём і як хочам жыць, толькі і ведаеце: абы вайны не было...» А я ж не наракаю.

Мая старэнькая матуля ўжо другі год жыве са мной у гарадской кватэры. Нямоглая, на вуліцу выходзіць рэдка, усё сядзіць у сваім пакойчыку ды глядзіць тэлевізар, каб не так моцна заціскала сэрца самота. За свой гарадскі час маці наглядзелася тэлеперадач больш, чым за ўсё доўгае — ад прыпару да прыпару — папярэдняе жыццё.

Аднойчы мама пасля таго, як перагледзела розныя вечаровыя навіны пра грамадскі неспакой у краінах свету, закалоты, памежныя сутычкі ды міжнацыянальную разню, узрушаная, не ўтрымала ў сабе балючую трывогу:

— А-я-яй, што робіцца... Мусіць, будзе вайна... — і запытальна і разгублена паглядзела на мяне.

— Не, — адказаў я. — Не будзе!

І раптам адчуў слабіну ў сваіх простых словах, іх непераканаўчасць і дадаў:

— Не, мама. Адкуль ты ўзяла? Не будзе аніякай вайны. Была ўжо...

А ўсё адно зніякавеў, бо міжволі згадаў радкі блізкага маёй душы рускага паэта Мікалая Рубцова, здарожаны лірычны герой якога (верш «Рускі агеньчык») у цёмнай глухмені пайшоў на свят-ло ў акенцы і знайшоў начны прытулак з угрэўнай печчу, цёплай вопраткай у хаціне адзінокай бабулі. І пачуў ад яе такое самае пытанне:

«Огнём, враждой
Земля полным-полна,
И близких всех душа
не позабудет...
— Скажи, родимый,
будет ли война?
И я сказал: — Наверное, не будет.
— Дай бог, дай бог...
Ведь всем не угодишь,
А от раздора пользы не прибудет... —
И вдруг опять:
— Не будет, говоришь?
— Нет, — говорю, — наверное, не будет!
— Дай бог, дай бог...»

Вось гэтае «напэўна», такое зашмальцаванае і такое далікатна-трапнае ў гэтым кантэксце слова і развярэдзіла маю душу. Але хіба мог я сказаць яго маме, хіба павінен я гаварыць з ёй так, як хочацца пісаць...

Калі разабрацца, дык і для мяне сённяя галоўнае — абы не было вайны.

Праўдзівае разуменне раю дадзена толькі шчырым вернікам. Чалавек, які надзелены духоўным зрокам, бачыць у Божым бласкавёным кутку не толькі затулак ад хвароб і смерці, не толькі вызваленне ад зморных клопатаў па здабыванні хлеба на кожны дзень, не толькі атуляльную, сатканую з душэўнага спакою і лагоды, пялюшку, не толькі дзіцячае дурэнне пад шапатлівым Дрэвам Жыцця ў дзіўнай суладнасці з усімі жывымі істотамі, калі можна, як катуську, пачасаць за вухам тыгра... Не толькі... Ён разумее, што рай — найперш месца сустрэчы з Богам ды поўныя святла з Ягонай ласкі і спагады размовы з Ім... Не раўнуючы, як было ў Адама з Евай да выгнання: Гаспад прыходзіў да іх штовечар, гутарыў, патлумачваў што да чаго ў свеце, настаўляў на правільнае жыццё як клапатлівы бацька. А ў рэшце рэшт, раззлаваны непаслухмянствам, выправіў свавольнікаў у поўны небяспекі свет, як людзі бывае выпраўляюць з дому шкадлівых дзетак-перагросткаў. Засталося толькі святло са шчыліны прыадчыненых — перш за ўсё нашым ўяўленнем — дзвярэй у Ягоны запаветны куток. Грукаць у дзверы не трэба: ідзі па жыцці праведным шляхам, расці дзяцей, любі людзей, не рабі ім зла, бойся Бога — і дзверы ў ягонае царства адчыняцца. ...Пасля непазбежнага для кожнага чалавека апошняга імгнення, якое напоўніцца не падуладнай усведамленню, існай і страшнай сваёй глыбінёй вечнасцю.

А святло са шчыліны прыадчыненых дзвярэй бруіцца і бруіцца...

Душа ўлагоджваецца існаваннем на свеце ўнучкі і ўнука, дочак і матулі...

З алоўка ў начной цішы саслізгваюць на чысты аркуш пялёсткамі райскай квецені родныя словы...

Лісцінку маёй гумавай лодкі павольна нясе ласкавая плынь Касплі: ад адной кветкавай купіны — да другой, ад аднаго спеўнага птушынага хмыза — да новага, не менш рознагалосага, ад самовага віра — да шчупачынага, ад вёскі да вёскі, у якіх жывуць прыхільныя, як радня, людзі...

Мілагучная Каспля падалася мне аднойчы рукавом райскай плыні...

Калі я скажу, што рай на зямлі — гэта Радзіма, хто мне паверыць?..

■ Бяспека руху

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ ДЗЯЦЕЙ АД НЕПРЫЕМНАСЦЯЎ НА ДАРОГАХ?

Летнія канікулы адлічваюць свае апошнія дні. Крыху больш чым праз тыдзень на заняткі адправяцца сотні тысяч школьнікаў. Цяпер жа многія з іх паступова вяртаюцца дадому пасля доўгага адпачынку ў вёсцы. Гэты час лічыцца ў інспектараў дарожнага руху адным з самых напружаных: усё-такі дзеці, знаходзячыся па-за межамі вялікіх гарадоў, адвыклі ад імклівасці іх вуліц. А напярэдзе ў школьнікаў яшчэ штодзённыя падарожжы з дому на заняткі і назад. Дык як жа засцерагчы дзяцей ад непрыемнасцяў на дарогах?

— З 26 жніўня па 6 верасня ў краіне, па традыцыі, будзе праводзіцца комплекс мерапрыемстваў «Увага — дзеці!». Мы заклікаем кіроўцаў аўтатранспарту ездзіць у гэты час з уключаным бліжнім святлом фар, каб школьнік мог бачыць аўтамабіль здалёк, — гаворыць **старшы інспектар па асобых даручэннях упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў Ганна БАНАДЫК.**

З пачатку года на беларускіх дарогах загінулі 13 дзяцей, а яшчэ 261 юны ўдзельнік дарожнага руху атрымаў траўмы. Увогуле зараз супрацоўнікі ДАІ назіраюць дзіўную тэндэнцыю. Калі яшчэ сем-восем гадоў таму два з кожных трох ДТЗ адбываліся па неабачлівасці дзяцей, то зараз гэтую сумную пальму першынства перахапілі кіроўцы. Гэта сведчыць аб тым, што школьнікі пачалі больш свядома паводзіць сябе на праезнай частцы.

З пачатку года на дарогах загінулі 13 дзяцей, траўмы атрымаў 261 юны ўдзельнік дарожнага руху.

У кожнай школе абавязковымі сталі куткі бяспечнага руху, дзе на стэндах намалявана схема мікрараёна з найбольш бяспечнымі маршрутамі дадому. Гэтыя шляхі пракладаюцца з улікам таго, каб вучні пераходзілі як мага менш дарог.

Сёлета школьнікаў у першы вераснёвы тыдзень чакаюць спецыяльныя лінейкі і пазакласныя гадзіны, на якіх інспектары яшчэ раз нагадаюць дзецям правілы дарожнага руху. Але цяпер вучням тлумачаць не толькі абавязкі пешахода, але і пасажыра. Яно і не дзіўна: знайсці сям'ю, дзе б не было аўтамабіля, з кожным годам усё складаней. Ды вось толькі бацькі часам грэбуюць правіламі: возяць маленькіх сыноў ці дачок без спецыяльных аўтакрэслаў ці ўвогуле на руках, не прышпільваюць іх рамянямі бяспекі на заднім сядзенні. А расплачваюцца за гэтую неахайнасць дзеці... Не забываюцца інспектары і на юных кіроўцаў.

— Калі мы ўводзілі некалькі гадоў таму абавязковае атрыманне правоў на кіраванне мапедамі, то з гэтай нагоды ў наш адрас гучала шмат крытыкі, — працягвае Ганна Банадык. — Аднак сёння мы бачым, што гэтае рашэнне было правільным, бо дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам непаўналетніх кіроўцаў можна зараз пералічыць на пальцах.

Інспектары нават узялі на ўзбраенне тактыку пакватэрнага абходу юных вадзіцеляў. У прысутнасці бацькоў такія кіроўцы ставяць подпіс пад папярэджаннем, што яны валодаюць сродкам павышанай небяспекі.

Супрацоўнікі ДАІ гавораць без залішняга пафасу: правілы дарожнага руху напісаны крывёй тых, хто іх парушае. Таму найлепшы спосаб засцерагчы сябе ад непрыемнасцяў на дарозе — быць пільным і сумленным.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■

УНП 100092167

Предложение о покупке акций

ОАО «Центроэнергомонтаж»

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж», 220033 г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Цель приобретения акций	**Сокращение общего количества акций для последующего аннулирования**
Количество приобретаемых простых (обыкновенных) акций (штук)	**10 000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**200 000**
Сроки, форма и порядок расчета	**Оплата производится в течение 30 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи. Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций.**
Адрес, по которому будут представляться предложения акционеров и заключаться договоры купли-продажи акций	**г. Минск, переулок Велосипедный, д. 7**
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	**Со 2 сентября 2013 года по 13 сентября 2013 года**
Даты начала и окончания покупки акций	**С 17 сентября 2013 года по 31 октября 2013 года**

■ Апладысменты

ТАКАЯ ШЧЫРАЯ ІГРА...

Народны тэатр стаў самым родным для жыхароў Беразіно

Бярэзінскі народны тэатр раённага Дома культуры вядзе адлік сваёй гісторыі з пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Спачатку ён не вылучаўся асаблівым рэпертуарам: спектаклі ставіліся спантанна. Але паступова тэатр умацоўваў свае пазіцыі, а мясцовыя акцёры раслі прафесійна. У 1978-м тэатру прысвоілі ганаровае званне «Народны».

Дзеля каханай...

Мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пытляк узначаліў калектыў у 1995 годзе. Дагэтуль ён працаваў у Рускім драматычным тэатры ў Мінску. Але сталіцу прамяняў на цікі раённы гарадок дзеля любімай жонкі. З таго часу яму шмат удалося зрабіць. Па-першае, у творчым плане, па — другое выхаваць прыхільнікаў тэатральнага мастацтва. А яшчэ наладзіць у райцэнтры абласны фестываль народных тэатраў «Бярэзінская рампа».

— Такая думка ўпершыню з'явілася ў мяне ў 1995 годзе. Самадзейныя артысты на той час, як кажуць, варыліся ва ўласным саку, нікуды не выязджалі. А сэнс жыцця творчага чалавека — некуды паехаць, сябе паказаць ды паглядзець на працу сваіх калег, — зазначае Мікалай Мікалаевіч.

Народных тэатраў на Міншчыне шмат, але з іх творчасцю людзі знаёмы бадай што толькі ў родных мясцінах. Жыхарам Міншчыны ў прыватнасці і рэспублікі ў цэлым іх назвы мала пра што гаварылі.

Ідэю фестывалю, як прызнаўся мой суразмоўца, падказала само жыццё. Яшчэ ў Савецкім Саюзе існавала «Рампа сяброўства», якая збірала самадзейных артыстаў з краін Прыбалтыкі, Расіі, Беларусі. Варта сказаць, што задума была вельмі ўдалай: «Бярэзінская рампа» стала візітоўкай рэгіёна. Упершыню пробны тэатральны форум правялі ў 1997 годзе. Правялі і зразумелі, што адмовіцца ад яго ўжо немагчыма: вельмі вялікі рэзананс займеў ён у грамадстве, палюбіўся гледачу. Фестываль праходзіць раз у два гады, летась адбыўся дзявяты. Наступны год будзе для «Бярэзінскай рампы» асаблівым — юбілейным. Зазначу, што ахвотных паўдзельнічаць у фестывалі шмат.

— Але мы можам прыняць не больш за 8 тэатраў, — падкрэслівае Мікалай Мікалаевіч. — Ды і гэта для нас многа. Тэатральнае свята доўжыцца тры дні: пятніца, субота, нядзеля. І за гэты час трэба прагледзець не нейкія малыя формы, а паўнацэнныя спектаклі ў паўтары-дзве гадзіны. Акрамя таго, і перапынак нейкі патрэбны, каб людзі змаглі адпачыць, падсілкавацца. Іншых пляцовак, акрамя сцэны Дома культуры, у нас няма. Кожны год удзельнікі мяняюцца, але нейкі касцяк усё ж застаецца, як, напрыклад, Барысаўскі, Слуцкі народныя тэатры, ну і безумоўна, наш як гаспадар. Калі ў нашых калег з'яўляюцца цікавыя пастаноўкі, то, бясспрэчна, яны могуць паказаць іх падчас фестывалю.

— А ці хацелі б, каб фестываль, хросным ці родным бацькам якога вы з'яўляецеся, атрымаў афіцыйны статус міжнароднага?

— На мой погляд, гэта не мяняе сутнасці. Ён у нас і так, лічы, адкрыты для ўсіх. Калі мерапрыемству надаецца статус міжнароднага, то, відаць, трэба мяняць яго фармат, павялічваць колькасць удзельнікаў. А часовыя рамкі і магчымасці, як я казаў, не дазваляюць гэтага зрабіць. Зрэшты, наш тэатр не безыменны, ён мае назву народнага тэатра Бярэзінскага Дома культуры.

На спектакль — сем'ямі і класамі

За гады кіраўніцтва тэатрам Мікалай Пытляк паставіў шмат цудоўных арыгінальных спектакляў па творах беларускіх, рускіх і замежных драматургаў. Вось толькі некалькі : «Жаніцьба Бялугіна» па Астроўскаму, «Бяда ад пяшчотнага сэрца» Салагуба, «Восем любячых жанчын» Рабера Тама, «Вежа» і «Кім» Дударава, «Валянцін і Валянціна» Рошчына. І ўсе яны збіралі аншлагі. Кожная прэм'ера для бярэзінцаў — гэта сапраўднае свята. На спектаклі ходзяць сем'ямі, а

Мікалай ПЫТЛЯК з жонкай.

Узрост самадзейных артыстаў — ад 11 да 75 гадоў. Гэта і пенсіянеры, і сантэхнікі, і механікі, і інжынеры, і настаўнікі. Словам, прадстаўнікі ўсіх сацыяльных груп.

настаўнікі прывозяць дзяцей класамі з ўсяго раёна. І трэба бачыць, з якім захапленнем сочаць за дзеяннем на сцэне гледачы, як перажываюць за любімых герояў. А затым яшчэ доўгі час абмяркоўваюць пастаноўку, спрачаюцца. Але ніхто яшчэ не выказаў крытыкі ў адрас самадзейных артыстаў: іх ігра шчырая, самаадданая. І гэта, заўважу, таксама заслуга галоўнага рэжысёра, які змог выхаваць гледача і нават фанатаў тэатральнага мастацтва.

— У нас няма праблем з выканаўцамі любога жанру, кірунку — класічны гэта рэпертуар ці сучасны. Зрэшты, пытанняў такіх ніколі не ўзнікала, і, мне здаецца, іх не будзе. Ахвотных удзельнічаць у спектаклі намнога больш, чым ёсць роляў, — распавёў Мікалай Пытляк. — І самае складанае ў тым, што ўсе хочуць быць Гамлетам ці вялікім сацыяльным героем. Я заўсёды тлумачу, што драматургі не могуць стварацьстолькі галоўных герояў, каб усім хапіла, што няма маленькіх роляў, ёсць маленькія выканаўцы. І акцёры мяне разумеюць, пагаджаюцца іграць ролі незалежна ад таго, колькі там слоў ці рэплік.

Узрост самадзейных артыстаў — ад 11 да 75 гадоў. Гэта і пенсіянеры, і сантэхнікі, і механікі, і інжынеры, і настаўнікі. Словам, прадстаўнікі ўсіх сацыяльных груп. Нейкай вузкай накіраванасці па падборы акцёраў (напрыклад, інтэлігенцыі) няма. Мікалай Пытляк не прыхільнік такіх метадаў. Але часам кажуць, што ў яго «кіношны» падбор акцёраў. Ды мастацкі кіраўнік сцвярджае, што гэта, хутчэй, інтуіцыя: « Адчуваю, што чалавек можа. Не люблю слова «зоркі». Ёсць вельмі арганічныя выканаўцы, якія разумеюць, як данесці да людзей думку, ідэю. Але з усімі трэба працаваць», — упэўнены Мікалай Мікалаевіч.

У планах Мікалая Пытляка паставіць спектакль толькі з падлеткамі і дзецьмі па п'есе Людмілы Разумоўскай «Хачу дамоў». Твор прысвечаны памяці спявачкі Янкі Дзягілевай, якая ў 30 гадоў пайшла з жыцця. П'еса драматычная, сацыяльна вострая. Яна — пра дзяцей, што жылі ў Піцеры на гарышчах, у падвалах. Фінал яе трагічны: амаль усе беспрытульнікі ў канцы гінуць. «Гэта такая Рэспубліка ШКІД, але ў іншым праяўленні, — гаворыць Пытляк. — Тэма вельмі цікавая і да канца не раскрытая, але вельмі цяжкая псіхалагічна. Я правёў перамовы з бацькамі, маўляў, пачытайце, скажыце, не траўмірую вашых дзяцей? Азнаёміцца з тэкстам — адно, а вось уніknуць у сітуацыю, адчуць яе на сабе — іншая справа».

Якія мецэнаты ў глыбінцы?..

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі амаль ці не ў кожнага тэатра быў свой мецэнат. Падтрымліваць тэатры было пачэсна і прэстыжна. Сённяшнія алігархі ўкладваюць грошы ў футбольныя клубы, яхты, нерухомасць за мяжой... Ці спрабаваў Пытляк знайсці «свайго мільярдэра»?

— Няма такіх у нашым раёне. А калі ездзіць на пошукі ў Мінск, то не застанецца часу на творчасць, — жартуе мой суразмоўца. — Вядома, знаходзім спонсараў на правядзенне масавых мерапрыемстваў, каб штосьці закупіць, паколькі бюджэтных сродкаў не хапае. Гэта звычайна мясцовыя прадпрыемствы, арганізацыі, прыватныя асобы. Гэта разавая дапамога. Па вялікім рахунку, наш тэатр не мае патрэбы ў штодзённай падтрымцы, мы нармальна выконваем сваю справу. Але нам, акрамя фестывалю, хацелася б з'ездзіць туды, куды нас запрашаюць, ды не ўсе могуць заплаціць за візу 80 еўра. Апошні раз, калі ляталі ў Калінінград, нам дапамог аплаціць дарогу аддзел па справах моладзі. Дэкарацыі з сабой не вазілі — папярэдне дамовіліся з калегамі, каб дапамаглі іх зрабіць.

— Тэатральнае мастацтва — клопатная справа і не вельмі прыбытковая. Не хацелася ўсё кінуць, знайсці іншы занятак? — пытаюся ў Мікалая Мікалаевіча.

— Я ўжо прывык, што вялікіх грошай не было і не будзе. Зрэшты, колькі ні дай, усё роўна іх не хапае, па меры паступлення з'яўляюцца новыя запыты. Ды не ў грошах шчасце. Я чалавек з той эпохі, калі меркантыльныя справы менш за ўсё цікавілі.

Дадам, што творчую працу нельга перавесці на тоны надоенага малака і гектары зааранага поля. Яна каштуе інтэлектуальных высілкаў, нерваў і нават жыцця.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Нераўнадушныя нататкі

ПРЫГОДЫ КАТА ФЕРДЫНАНДА

Выпраўляючыся на ранішні ці вячэрні праменад, заўсёды паўтараю адно і тое ж: «Толькі б нікога не сустрэць!» Не, я не пра людзей, яны мне не замінаюць. Я пра братоў нашых меншых, кінутых сваімі гаспадарамі. Не магу глядзець, як кот ці сабака бездапаможна пазіраюць на мяне. З надзеяй, што вазьму ў дом і абагрэю.

Усіх не палашчыш — гэта я добра разумею. Але бываюць выпадкі, калі нічога не зрабіць проста немагчыма. Як тым разам. Ля машыны скакаў бела-чорны камяк. Нейкія два месяцы ад нараджэння, ён, проста смех, выгінаў спіну і распушваў хвост: маўляў, глядзі, які я вялікі і страшны. А потым стралой заляцеў на бярозу. «Куды ты, дурненькі, злазь», — прамовіла я. І кацяня не толькі паслухалася, а, падбегшы, пачало гуляць з маімі жоўтымі шлёпкамі. Узяла на рукі — мурлыкае і збіраецца засынаць. Вось дык істота! Хіба хтосьці мог выкінуць яе, такую ласкавую і кемлівую. Не, кацяня дакладна згубілася, напрыклад, выскачыла з машыны пасля паездкі на лецішча? Пачала распытваць людзей пра лёс пушысціка, і пажылая кабеціна вярнула мяне на зямлю. Аказваецца, яго на ўскрайку нашага «Уручча» проста выкінулі з шыкоўнага мінівэна.

І што рабіць? Дадому я яго не магу ўзяць. Наш гаспадар цвёрда перакананы, што каты і сабакі павінны жыць у вёсцы... Але Луіс, як назвала я гэтага арыстакратычнага ката, падобна на тое, вырашыў інакш. Ён проста павіс на маёй калашыне, і адарваць яго мог хіба што ўраган. «Табе прызначана, ідзі збірайся на сустрэчу», — адгаворваю сябе. Але сэрца не суцішалася, і я панесла Люсіка да сваёй суседкі — яна спагадае бяздомным катам.

«Біць не будзеце?» — спрабую распачаць дыялог. «Эх, такая прыгажосць», — толькі ўздыхнула Ніна Паўлаўна. І хоць яна таксама не мае магчымасці пакінуць Люсіка ў сябе, пагаджаецца часова прытуліць. Я тым часам расклейваю аб'явы: «Шукаем надзейных гаспадароў для прыгожага, душэўнага і разумнага коціка», а нашы хлопцы, Віктар і Сяргей, фатаграфуюць яго і размяшчаюць аб'явы ў інтэрнэце. Адначасова праводзім прафілактыку: купляем лекі ад кішэчных паразітаў, мыем спецыяльным шампунем ад блох і чысцім вушы — ну, не аддаваць жа каму-небудзь «ката ў мяшку.»

Праблема бяздомных жывёл стаіць сёння вельмі востра. Яе пакуль што вырашаюць шляхам адлову і адстрэлу. Супраць такіх жорсткіх аперацый выступаюць жыхары і зоаабаронцы, якія, дарэчы, ініцыіравалі прыняцце адпаведнага закона. Разгляд яго ў парламенце адкладзены, бо няпростым аказалася звязаць абстрактную любоў да братоў нашых меншых і эканоміку. Праўда, у розных гарадах спагадлівыя людзі пачынаюць ствараць прытулкі для бадзяжных шарыкаў і мурак — напрыклад, у Віцебску. Нямала і тых, хто самастойна займаецца гэтай справай. Як каляжанка Надзя, якая апошнім уладкавала ў сям'ю Вольгі і Валерыя коціка Барыса. У Мінску ёсць таварыства абароны жывёл «Эгіда». Там іх лечаць, вучаць зноў верыць людзям, стэрылізуюць (дарэчы, трацяць на гэта штомесяц ад 10 да 20 мільёнаў рублёў ахвяраванняў). І пасля аддаюць у добрыя рукі. Да слова, у інтэрнэце працуе дабрачынны партал абароны і правоў жывёл — www.egida.by. Там можна пакінуць аб'яву пра сабачку ці коціка, які выскачылі ў акно ці шмыганулі ў дзверы. Некаторым шанцуе — іх знаходзяць старыя ці новыя гаспадары. Адну кошку нават павезлі ў далёкае замежжа. Нам удача не ўсміхнулася: былыя гаспадары Люсіка не адгукнуліся. А яно і лепш — навошта маленькай «пандзе» гэтыя здраднікі?

Мае і сяброўкі Таццяны (у яе, дарэчы, два пестуны — Рудзік і Юня) намаганні не аказаліся марнымі. Знайшліся ахвотнікі стаць гаспадарамі Луіса. Некаторых мы самі адхілілі, бо засумняваліся, што яны будуць для Люсіка надзейнымі сябрамі. А вось тыя, хто падыходзіў, па розных прычынах маглі забраць яго не адразу. Тым часам я ўжо прыкіпела да кацяняці... І рызыкнула. Прынесла яго дадому: маўляў, усяго на пару дзён. І кот не разгубіўся, адразу ўцяміў, ад каго залежыць яго далейшы лёс. Паказаў пару кульбітаў, пацёрся аб ногі, лізнуў у руку і растапіў сэрца непахіснага барацьбіта за свабоду катоў і сабак. Назвалі кацяня (так настаяў сын) Фердынандам. Прысадзісты, з характэрнымі плямамі кот і сапраўды нагадвае нямецкі танк. Так і прыжыўся ён у нас. Паводзіць сябе добра, шкоды не робіць — што і казаць, маленькі мудрэц. І цяпер кожную раніцу толькі і чуеш ад мужа: «Пакармілі Федзьку як след? Чаму домік не збудавалі? Калі новую цацку купіце?» А калі кот Фядоскін захварэў (нагадалі пра сябе вулічныя нягоды) — дык і з грашыма на ветурача не лічыўся, і перажываў нібыта за дзіця. Вось як змяніў надвор'е ў нашым доме маленькі камяк поўсці!

А для мяне тыдзень турбот, надзеі і расчараванняў, звязаны з уладкаваннем Федасея, нанова адкрыў некалькі жыццёвых ісцін. Вось такую, напрыклад. Калі ў вырашэнні нейкай праблемы спадзяешся на аднадумцаў, трэба быць гатовым, што ўсё ляжа выключна на твае плечы. І яшчэ. Не варта, здавалася б, «прачытаных» да апошняй коскі людзей успрымаць адназначна. Псіхалогія — вельмі тонкая матэрыя...

Вера МУР.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗГАРЭЎ СТАРЫ МЛЫН...

Ехала ў выхадныя з дачы цераз вёску Воўчын Камянецкага раёна, стары млын яшчэ стаяў на рацэ Пульва. А ў аўторак-сераду на сайтах паявілася паведамленне, што ён згарэў. Двухпавярховы гмах, першы паверх якога зроблены з цэглы і каменю, а другі складзены са смалістых пушчанскіх бярвёнаў, надаваў старадаўняму Воўчыну асаблівы гістарычны шарм. Тым больш, што стаяў ён на ўяздзе ў вёску з боку Брэста. У зводках крымінальных здарэнняў пазначана, між іншым, што пабудова не была ўключана ў спіс культурна-гістарычных каштоўнасцяў.

Так, не была, але старэйшыя людзі кажуць, што млын стаяў яшчэ пры іх бацьках і дзядах, што спраўна выдаваў муку, у тым ліку калгасную, аж недзе да 1990-х гадоў. Потым яго проста кінулі як непатрэбную рэч, што адслужыла свой век. Фармальна ён быў ва ўласнасці сельгаспрадпрыемства «Усход-Камянец», але ніхто будынкам не займаўся. З млына даўно вывезлі абсталяванне, якое можна было вывезці, аддзерлі дошкі, якія паддаліся лому. Засталіся толькі сцены са смалістай, нібы бурштын, драўніны. І яны гарэлі як факел. Такі фінал для стагадовага млына цалкам заканамерны. За адсутнасцю вокнаў і дзвярэй днём у будынку гулялі дзеці, вечарам збіраліся бамжы і выпівохі. Магчыма, хтосьці кінуў непатушаны акурак. Апошнім часам стаяла спёка.

Калі пабудавалі млын, ніхто дакладна не ведае. Але старажылы аднадушныя: будынку больш за сто гадоў. Цэлы век ён служыў людзям. Мабыць, памятае тутэйшы касцёл ва ўсёй яго красе і іншыя старэйшыя воўчынскія славутасці. Воўчын — мясціна асаблівая. Тут нарадзіўся апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Недзе тут знайшлі спачын і яго астанкі. У Воўчыне ў свой час быў шыкоўны палац продкаў караля па мацярынскай лініі — князёў Чартарыйскіх. Фрагменты фундамента таго палаца і зараз можна разгледзець недалёка ад касцёла. Воўчынскі касцёл Святой Тройцы XVIII стагоддзя хоць і павольна, але адраджаецца. Ужо ўзведзены дах, устаноўлены на вежы гадзіннік. Сцены, ачышчаныя ад бруду і моху, зараз у рыштаваннях, усяляюць пэўны аптымізм, даюць надзею на магчымы росквіт Воўчына як турыстычнага цэнтра. Для турызму гэта ідэальнае месца. Адна толькі асоба Панятоўскага: яго няпросты жыццёвы шлях, чуткі і легенды, якія суправаджалі ўсё жыццё, прыцягвае. Як і тое, што Панятоўскія пакінулі пісьмовае сведчанне: «Мы лічым сябе радавітымі ліцвінамі, бо нарадзіліся і прынялі святое хрышчэнне ў Воўчыне, каля Брэста...» Легенд хапае і пра сам Воўчын. Некаторыя мясцовыя жыхары лічаць, што сярод іх аднавяскоўцаў ёсць пазашлюбныя нашчадкі Чартарыйскіх. Цяпер вось загадка перапахавання астанкаў караля. Труну з імі прывезлі ў Воўчын з Піцера ў 1938 годзе па загадзе Сталіна. Нехта з жыхароў потым недзе пахаваў косці. Дзе? Ніхто не ведае. Чаму б не ў падмурку старога млына?

Гэта малаверагодна: млын тады яшчэ ваўсю працаваў. Але кожная старая будыніна, як і паўразваленая сінагога, камяні старадаўняй рэзідэнцыі, трохсотгадовыя лістоўніцы ўяўляюць каштоўнасць у агульнай гісторыі мястэчка. Калі быць аптымістам і дапусціць, што некалі наступіць адраджэнне Воўчына як гісторыка-турыстычнага пункта, млын якраз быў бы дарэчы. Толькі хто яго мог захаваць? Калгасу гэта не трэба, кіраўнікоў пытаюць за паказчыкі па надоях і намалотах. У сельсавета, як заўсёды, грошай лішніх не знайшлося, каб забіць вокны і дзверы і абараніць будыніну ад няпрошаных гасцей. У такіх выпадках звычайна працуе грамадская ініцыятыва. Успамінаю, колькі студэнтаў, добраахвотнікаў шчыравала на расчыстцы руін Ружанскага палаца задоўга да пачатку яго рэстаўрацыі. Тут жа не знайшлося ні моладзевай арганізацыі, ніякай іншай, чые актывісты звярнулі б увагу на кавалачак гісторыі краю і дапамаглі б яму выжыць. А значыць, і вінаваціць няма каго. Млын спаліла наша абыякавасць.

Святлана ЯСКЕВІЧ

ДОЖДЖ ВЫСТАВЕ НЕ ПЕРАШКОДА

Жыхарка вёскі Рэкта Жлобінскага раёна Ганна Серафімовіч працуе над стварэннем мясцовага старажытнага касцюма. Спачатку рэканструкцыяй народных строяў, а потым і іх стварэннем Ганна Іванаўна захапілася з тых часоў, калі яе маленькім дачушкам для ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці спатрэбілася адпаведнае адзенне.

Цяпер калекцыя касцюмаў-строяў у гэтай майстрыхі даволі багатая. Частку калекцыі Ганна Серафімовіч дэманструе на выстаўках, а мадэлямі яе твораў з'яўляюцца... лялькі, якія яна таксама вырабляе сваімі рукамі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.02	20.21	14.19
Віцебск	— 5.48	20.14	14.26
Магілёў	— 5.52	20.11	14.19
Гомель	— 5.52	20.04	14.12
Гродна	— 6.17	20.36	14.19
Брэст	— 6.22	20.32	14.10

Месяц

Поўня 21 жніўня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Вячаслава, Лаўрэнція, Рамана.*
К. *Валерыі, Ружы, Апалінара, Валяр'яна, Віктара, Філіпа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Група рускіх турыстаў, што заблукалі ў джунглях, была знойдзена па папугаях, якія лаяліся.

Яна:
— А я нарэшце здала на правы! Хачу машыну сабе купіць. Можа параіш, якая для дзяўчыны лепш за ўсё?
Ён:
— Пральная!

Шахматыст гуляў з дзяўчынай па парку, калі раптам на іх напалі хуліганы. Цвяроза ацаніўшы сітуацыю, ён вырашыў ахвяраваць каралевай.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.974. Індэкс 63850. Зак. № 3620.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2013 года.